ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 91 (1625) | Пятніца, 17 лістапада 1961 года | Цана 4 кап.

СЛАВА І ГОРДАСЦЬ ЗЯМЛІ РУСКАЙ

19 ЛІСТАПАДА па рашэнню Сусветнага Савета Міру чалавецтва адзначае знамянальную дату — 250-годдзе з дня нараджэння Міхаіла Васільевіча Ламаносава.

Імя Ламаносава выклікае ў нашым уяўленні вобраз незвычайнага чалавека, адоранага рэдкім талентам, вобраз мужнага патрыёта і змагара, які ўсё сваё палымянае жыццё аддаў роднаму народу.

Мінаюць стагоддзі. Час нараджае ўсё новыя і новыя факты, якія сведчаць аб магутнасці чалавечага генія. Але слава нашага вялікага продка не меркне. Знаходзячыся сёння на вяршыні сучасных эканамічных, палітычных і культурных дасягненняў чалавецтва, савецкі народ з пачуццём павагі і ўдзячнасці ўспамінае таго, хто так многа зрабіў для радзімы ў тыя далёкія часы, калі яна спакваля набірала сілы, каб вырвацца з абдымкаў патрыярхальшчыны. Перад яго жывой памяццю схіляе ў пашане галаву і сусветная навука, абавязаная вялікаму сыну рускага народа шматлікімі ідэямі і адкрыццямі.

Ламаносаў — бліскучая старонка нашага нацыянальнага летапісу. Пушкін нездарма назваў яго нашым першым універсітэтам. Вялікі філосаф, гісторык, грамадскі дзеяч, хімік, біёлаг, механік, географ, астраном, мастак, паэт, тэарэтык літаратуры... — Ламаносаў пакінуў выразны след ва ўсіх галінах навукі і культуры. Можна толькі здзіўляцца рознабаковасці яго розуму, невычэрпнасці яго інтэлектуальных сіл.

Разважаючы аб шляхах зараджэння і развіцця вялікай рускай літаратуры, В. Г. Бялінскі пісаў: «...Першыя спробы былі надзвычай слабымі і няўдалымі. Але раптам... на берагах Ледавітага мора, нібы паўночнае ззянне, засвяціў Ламаносаў. Асляпляльнай і прыгожай была гэтая з'ява! Яна даказала сабой, што чалавек ёсць чалавек у любым становішчы і ў любым клімаце, што геній умее перамагаць усе перашкоды, якія ні супрацьстаўляе яму варожы лёс, што, нарэшце, рускі здольны да ўсяго вялікага і цудоўнага не горш еўрапейца...»

Тым больш захапляе нас сёння ўсё зробленае Ламаносавым, што жыў і тварыў ён далёка не ў спрыяльным «клімаце». Толькі безмежнае жаданне бачыць сваю радзіму ў перадавых радах чалавецтва дапамагала яму зносіць шматлікія нягоды, якія выпалі на яго долю. Адно тое, што Ламаносаў быў сялянскім сынам, каштавала яму многа — і тады, калі ён ірваўся да навукі, прыйшоўшы ў Маскву з далёкай Архангельшчыны, і тады, калі рускай навукі і культуры ўжо нельга было ўявіць без Ламаносава. Саноўная Расія змушана была цярпець чалавека «чорнай косці» ў сваім асяроддзі, расступаючыся перад яго магутным талентам, але ён заўсёды бачыў яе пагардлівую міну і выслухаў нямала абразлівых слоў. Праз усю творчую біяграфію вялікага мысліцеля праходзіць вострая барацьба з іншаземцамі, якія ў той час апанавалі былі рускую навуку, з афіцыйнымі прадстаўнікамі царквы, для якіх матэрыялістычны светапогляд Ламаносава, яго нянавісць да папоўшчыны і цемрашальства былі страшнай пагрозай. Барацьба гэтая адзначана і такім ганебным для самадзяржаўя фактам: Ламаносаў на некаторы час быў выгнаны з акадэміі і некалькі месяцаў знаходзіўся пад арыштам.

Ідэя прагрэсу радзімы, вера ў невычарпальныя сілы рускага народа былі страсцю душы Ламаносава. Ён быў цвёрда перакананы, што расійская зямля можа нараджаць «собственных Платонов и быстрых разумом Невтонов», што рускаму народу наканавана вялікая гістарычная місія. У імя гэтага вялікі патрыёт не шкадаваў сваіх сіл і мірыўся з сваім нялёгкім лёсам. «За тое цярплю, — пісаў ён, — што стараюся абараніць працу Пятра Вялікага, каб вывучыліся расіяне, каб паказалі сваю годнасць».

Інтрыгі і адкрытыя ганенні скарацілі жыццё Ламаносава, але яно было і застанецца назаўсёды вялікім па зместу і сэнсу, па той спадчыне, што падараваў геній свайму народу і ўсяму свету.

Трывалыя цагліны паклаў геніяльны рускі вучоны ў падмурак прыродазнаўства, апярэдзіўшы шмат у чым сучасных яму мысліцеляў. І ў гэтым важную ролю адыграла тое, што ён стаяў на матэрыялістычных філасофскіх пазіцыях. Ён зрабіў нямала, каб вырваць уяўленне чалавека аб навакольнай рэчаіснасці з-пад гнёту ідэалізму і папоўшчыны. Навуковыя адкрыцці Ламаносава, у прыватнасці, такія, як закон захавання матэрыі, энергіі і руху, новая тэорыя цеплыні, тэорыя ўтварэння навальнічных хмар, працы ў галіне хіміі, мінералогіі, астраноміі і г. д., наносілі сакрушальны ўдар па ідэалістычных і рэлігійных дагматах і рухалі сусветную навуку далёка ўперад.

Глыбокі дапытлівы розум Ламаносава спалучаўся з рашучасцю і смеласцю сапраўднага наватара. Патрэбы эпохі, адзначанай вызваленнем ад сярэдневяковага застою, знайшлі ў ім надзвычай яркае выяўленне. Дзейнасць вялікага вучонага была такой жа шматграннай, як кола неадкладных праблем эканамічнага і культурнага развіцця Расіі. Яго хвалявалі і перспектывы асваення незлічоных багаццяў Сібіры, і праблемы развіцця паўночнага мараплавання, і магчымасці палёту чалавека ў паветры (створаная ім «аэрадромная машына» была першай у свеце дзеючай мадэллю гелікаптэра), і развіццё прамысловасці каляровага шкла, і многае, многае іншае — усяго не пералічыць.

І чым больш ён ажыццяўляў задум, тым больш з'яўлялася новых ідэй. У апошнія гады свайго жыцця Ламаносаў задумаў рад дзяржаўных праектаў — «об истреблении праздности, об исправлении нравов и о большем народа просвещении, об исправлении земледелия, об исправлении ремесленных дел и художеств, о лучших пользах купечества, о лучшей государственной экономии, о сохранении военного искусства во время долговременного мира, о размножении и сохранении российского народа».

Многім абавязана Ламаносаву руская літаратура. Ён быў, паводле слоў Бялінскага, яе бацькам і пестуном, яе Пятром Вялікім. У абліччы Ламаносава спалучаліся выдатны паэт свайго часу, тэарэтык літаратуры і мовы, смелы заканадаўца новых творчых прынцыпаў. Ён рашуча выступіў супраць неўласцівых рускай мове форм вершаскладання і распрацаваў новую сістэму верша, якой руская паэзія карыстаецца і сёння. Шматлікія працы Ламаносава па мове і тэорыі літаратуры, яго небагатая, але разнастайная паэтычная спадчына аказалі вялікі ўплыў на літаратурны працэс.

Гістарычнымі эпохамі вымяраецца ўжо шлях, які прайшла наша краіна ад тых далёкіх часін, калі жыў і тварыў геніяльны мысліцель, асветнік, паэт, І навука, і літаратура ўзняліся на вышыні, пра якія цяжка было раней і марыць. Але імя Ламаносава не загубілася ў петытным моры энцыклапедычных старонак. Яно жыве ў жывой памяці народа, у працы вучоных і творчых пошуках майстроў слова.

Вучоным Ламаносаў дае прыклад мэтанакіраванай дзейнасці, узор спалучэння навукі з практыкай. Усё, што ні рабіў ён, выклікалася патрэбамі развіцця прадукцыйных сіл Расіі, яе культуры. Чарнышэўскі сказаў: «Ламаносаў горача любіў навуку, але думаў і клапаціўся выключна аб тым, што неабходна было для дабра яго радзімы. Ён хацеў служыць не чыстай навуцы, а толькі бацькаўшчыне».

Літаратараў і мастакоў яго творчасць натхніце пафасам гарачага патрыятызму. Паэзія Ламаносава прасякнута ідэяй выхавання ў чалавека грамадзянскага абавязку, яна настройвае на хвалю высакародных пачуццяў і думак. Ламаносаўскія оды ўслаўляюць велічны вобраз Расіі, яны насычаны матывамі глыбокай веры ў яе цудоўную будучыню. Рускія воіны-пераможцы, вучоныя, якія разгадвалі таямніцы прыроды, дзяржаўныя дзеячы, якія дбалі аб славе расійскай зямлі, — вось хто перш за ўсё хваляваў ламаносаўскую музу. На шляхах высокай героікі бачыў Ламаносаў найбольшы сэнс паэтычнай творчасці. У вядомым паэтычным дыялогу-палеміцы «Размова з Анакрэонам» ён пісаў:

Хоть нежности
сердечной
В любви я не лишен:
Героев славой вечной
Я больше восхищен.

Сёння героіка-грамадзянская паэзія цячэ шырокай ракою, але мы не забываемся, што пачыналася яна ручайком у творчасці Ламаносава.

250-годдзе з дня нараджэння Міхаіла Васільевіча Ламаносава — гэта свята рускай культуры, якая заўсёды несла чалавецтву высакародныя ідэалы і паклала на алтар прагрэсу безліч вялікіх здзяйсненняў.

Да ламаносаўскіх дзён

Працоўныя Беларусі шырока адзначаюць 250-годдзе з дня нараджэння вялікага рускага вучонага, мысліцеля і паэта Міхаіла Васільевіча Ламаносава. Да гэтай даты ў рабочых клубах, хатах-чытальнях, сельскіх дамах культуры, бібліятэках створаны выстаўкі, якія расказваюць аб жыцці і дзейнасці вялікага вучонага, чытаюцца лекцыі і даклады, праводзяцца канферэнцыі.

Прэзідыумам Акадэміі навук БССР створана камісія, у склад якой увайшлі акадэмікі М. Ярмоленка, В. Купрэвіч, К. Лукашоў, К. Крапіва, Ф. Вінакураў і іншыя. Вучоныя Акадэміі навук БССР правядуць урачысты сход, прысвечаны Ламаносаву, на якім будуць прачытаны даклады аб вялікім мысліцелю і асветніку.

Цікавы план мерапрыемстваў склалі работнікі Рэспубліканскага таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў. Лектары і дакладчыкі таварыства правядуць на прадпрыемствах сталіцы, у абласных і раённых цэнтрах Беларусі тэматычныя вечары і лекцыі «Ідэі Ламаносава і дасягненні савецкай навукі». Віцебскае аддзяленне таварыства сумесна з абласной бібліятэкай арганізуе агульнагарадскі вечар, прысвечаны рускаму вучонаму.

Дзяржаўная бібліятэка імя Ул. І. Леніна ў Мінску падрыхтавала цікавую выстаўку. У сямі раздзелах экспазіцыі шырока паказана жыццё і навуковая дзейнасць нашага вялікага суайчыньніка. Тут прадстаўлены творы Ламаносава, сабраны манаграфіі і кнігі аб заснавальніку рускай навукі. Выстаўка, прысвечаная слаўнаму жыццю М. В. Ламаносава, адкрыта ў Магілёўскай абласной бібліятэцы. Работнікі бібліятэкі выслалі ў раёны метадычныя пісьмы, у якіх шмат матэрыялаў для арганізацыі кніжных выставак, аглядаў, вітрын.

Ламаносаўскія вечары праводзяць культасветработнікі Гомельшчыны, Брэстчыны, Гродзеншчыны.

Сёння — Міжнародны дзень студэнтаў. Мільёны юнакоў і дзяўчат розных кантынентаў свету адзначаюць гэты дзень і, у думках трымаючыся моцна за рукі, гавораць:

— Мы — за мір!

— Мы — за шчаслівае юнацтва!

— Мы — за шчасце ўсіх працоўных зямлі.

Студэнты Савецкага Саюза — самыя гарачыя прыхільнікі міру, прыхільнікі міжнароднага супрацоўніцтва і брацтва.

З году ў год расце шматтысячная сям'я беларускіх студэнтаў. У інстытутах, тэхнікумах, вучылішчах, набываюць веды юнакі і дзяўчаты, якія прыехалі з розных куткоў нашай рэспублікі. Яны стануць урачамі, выкладчыкамі, інжынерамі, артыстамі, музыкантамі. Усе свае веды яны аддадуць таму, каб квітнела родная краіна.

Прыкладам вялікай шматнацыянальнай дружбы з'яўляецца і тое, што ў навучальных установах Мінска, Віцебска, Гомеля займаюцца студэнты Украіны, Латвіі, Грузіі, Расійскай Федэрацыі.

Наш фотакарэспандэнт пабываў у Беларускім політэхнічным інстытуце на аўтатрактарным факультэце. Ён створан нядаўна. Яму крыху менш год, чым славутым беларускім волатам-самазвалам маркі «МАЗ» і трактарам «Беларусь». На факультэце займаецца каля ста юнакоў і дзяўчат, якія пажадалі стаць аўтамабіле- і трактарабудаўнікамі.

На здымку вы бачыце студэнтаў: пасланца Мангольскай Народнай Рэспублікі Чыміддаша Хасдоржа, беларуса Георгія Паўлава, украінку Людмілу Ардзелян, мангола Мянганбатара Найдана і беларуса Леаніда Сталярова. Яны чытаюць кнігу. Кніга, відаць, цікавая — вясёлая ўсмешка на тварах студэнтаў.

ПУЛЬС ГІСТОРЫІ

Кожны дзень нашай Радзімы поўны гераічных подзвігаў народа, небывалых перамог працоўных рук і розуму чалавека, здзяйсненняў самых высокіх мар. Усюды — на заводах і фабрыках, на будоўлях і калгасных палях — чуецца поступ новага часу, новай эры чалавецтва, якую азнаменаваў XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, эры пабудовы камунізма.

Усе народы свету, усё прагрэсіўнае чалавецтва будзе помніць гэты з'езд як самую выдатную з'яву ў гісторыі, адну з самых вялікіх падзей нашай эпохі. Упершыню людзі ўсяго свету ўбачылі такі яркі маяк, які азарыў ім прасторы ў будучыню, у заўтра. Гэтым маяком стала новая Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, праграма пабудовы камуністычнага грамадства. У ёй — нашы думы і імкненні, нашы жаданні і надзеі, наш лёс, наша шчасце.

Праграма партыі — гэта праграма ўсяго савецкага народа, які прымаў самы актыўны ўдзел у яе абмеркаванні, у яе стварэнні і на долю якога выпала самае вялікае шчасце — здзейсніць, ператварыць у жыццё неўміручыя ленінскія ідэі, запаветныя мары многіх і многіх пакаленняў людзей.

Думы партыі — гэта думы народа. Партыя і народ адзіныя ў сваёй працы, у сваіх імкненнях.

У дні XXII з'езда КПСС увесь народ гаварыў са сваёй роднай партыяй. Усе мы разам са сваімі пасланцамі, дэлегатамі з'езда і яго зарубежнымі гасцямі былі там, у светлым Крамлёўскім Палацы. Мы прыслухоўваліся да кожнага слова дакладаў нашага Мікіты Сяргеевіча, выступленняў удзельнікаў з'езда. Тое, аб чым яны гаварылі, было ў нашых думках, у нашых сэрцах. У кожным выступленні адчуваліся вялікія чалавечыя клопаты аб людзях, аб роднай краіне, аб тым, каб дасягнуць яшчэ больш выдатных поспехаў у галіне развіцця народнай гаспадаркі, культуры, каб наша жыццё стала яшчэ больш прыгожым і шчаслівым, каб хутчэй набліжаць светлае камуністычнае заўтра.

Партыя Леніна — партыя ўсяго народа. Усе працоўныя бачаць у ёй свайго мудрага правадыра, клапатлівую, ласкавую маці. Гэта адчуваецца штодзённа. Асабліва гэта адчувалася ў дні работы з'езда, які канчаткова асудзіў культ асобы і ўсё тое шкоднае, агіднае, што было звязана з ім. У гісторыі ніколі больш не павінен паўтарыцца той дэспатызм, тое беззаконне, якое панавала пры культе, асабліва ў гады масавых рэпрэсій, калі былі асуджаны і знішчаны многія сумленныя людзі. Партыя адкрыта сказала пра гэта народу і тым самым заваявала яшчэ больш высокі аўтарытэт сярод усіх простых людзей свету, яшчэ больш шчырую любоў і павагу.

З якім хваляваннем слухалі мы выступленні старэйшых камуністаў! Яны гаварылі пра роднага Ільіча, з якім разам працавалі, аб яго чуласці, чалавечнасці, аб тым, як ён вучыў быць уважлівым да людзей, да іх запатрабаванняў, клапаціцца аб іх і правільна разбірацца ў кожным канкрэтным пытанні, у лёсе кожнага чалавека.

Ленінскія ідэі, ленінская бацькоўская ласка, чуласць і патрабавальнасць знайшлі сваё самае глыбокае адлюстраванне ў новай Праграме і ў новым Статуце Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, прынятых XXII з'ездам КПСС.

Сёння, вывучаючы гэтыя гістарычныя дакументы, яшчэ і яшчэ раз думаеш аб той велізарнейшай працы, якую прарабіла наша партыя. Выпрацоўваючы сваю мудрую Праграму, праграму будаўніцтва камунізма, партыя ўважліва падслухала бішчэ нашых сэрцаў, усе нашы думы і жаданні. З якім хваляваннем і з якой незвычайнай радасцю мы чыталі і чытаем сёння заключныя радкі Праграмы: «Партыя ўрачыста абвяшчае: цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме!».

Прызнацца шчыра, калі я асабіста першы раз прачытаў гэтыя словы, сэрца забілася з такой радасцю і з такім натхненнем, нібыта была прачытана самая хвалюючая кніга аб нашым жыцці, аб жыцці ўсёй нашай краіны. Гэтыя словы, сказаныя партыяй народу, надалі кожнаму з нас столькі сілы і мужнасці, што мы гатовы пайсці на самы высокі подзвіг, на выкананне самай адказнай задачы.

Кожны радок Праграмы напаўняе сэрца небывалай радасцю і гордасцю за сваю Радзіму, свой народ, за сваю родную партыю — баявы авангард усіх працоўных у іх барацьбе за светлае будучае.

Асабліва ўзрастае роля партыі як арганізуючай і натхняючай сілы цяпер, у перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма. Яна, ведучы нас усіх верным ленінскім курсам, накіроўвае ўсе нашы справы, канцэнтруе ўсю нашу волю і энергію, вырашае ўсе задачы, якія ўстаюць перад намі на новых і новых этапах развіцця гісторыі.

Партыя Леніна ў сваёй новай Праграме заклікае ўсіх працоўных свету назаўсёды знішчыць войны, каб на зямлі панаваў вечны мір і спакой. Яна, не шкадуючы сваіх сіл, робіць усё для таго, каб народы свету жылі ў дружбе і брацтве, радасным мірным, шчаслівым жыццём. Гэта — жаданні ўсіх простых людзей свету. Гэта — гістарычная місія, якую выканаюць будаўнікі новага грамадства, будаўнікі камунізма.

XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза яшчэ мацней згуртаваў рады камуністаў і беспартыйных. Хоць не кожны з нас, савецкіх людзей, носіць каля сэрца партыйны білет, але сэрцамі мы ўсе — камуністы, людзі вялікай, светлай будучыні, якую ствараем усе разам, якую набліжаем сваёй сумленнай працай.

Дзе б ні быў, куды б ні паехаў сёння, усюды бачыш небывалы творчы ўздым народа, яго гераічную працу.

Толькі што ўчора, напрыклад, уступіла ў строй новая магутная электрастанцыя на Ангары. Сёння ў квітнеючы аазіс ператвораны Галодны стэп, у якім на працягу стагоддзяў гулялі непраходныя пяскі. Заўтра ці паслязаўтра, вось, вось, хлыне па трубах новага магутнага нафтаправода, што пракладваецца праз усю краіну, «чорнае золата». А там неўзабаве засвецяцца агні новага горада... І так кожны дзень. Возмеш любы нумар газеты і за радкамі невялічкіх заметак бачыш мільёны працаўнікоў, якія сёння зрабілі сваю краіну яшчэ больш багатай, чым была ўчора, а заўтра зробяць яшчэ больш багатай, чым сёння.

Гэта працуюць савецкія людзі, працуюць адзінай дружнай сям'ёй, не пакладаючы рук. Яны ўжо не словам, а справай адказваюць на рашэнні партыйнага з'езда, які ўскалыхнуў сэрцы ўсяго чалавецтва. Яны пачалі ўжо выконваць вялікую Праграму — маніфест нашых дзён. Яны ўжо ўступілі ў дваццацігадовы перыяд будаўніцтва камунізма, які пачаўся 17 кастрычніка 1961 года, у дзень адкрыцця гістарычнага XXII з'езда КПСС, а, магчыма, раней, калі на старонках газет з'явілася першы раз усім знаёмае і дарагое слова — праграма!

Не так даўно мне давялося пабываць у калгасе імя Леніна Слаўгарадскага раёна. Я там пазнаёміўся з адным вельмі яшчэ маладым чалавекам. Ён, па сутнасці, хлапчук, але справамі сваімі сказаў аб сабе ўжо як аб сапраўдным сталым працаўніку, што ідзе поплеч з вопытнымі, бывалымі людзьмі.

Склалася так, што малы Валодзя Стаднік пакінуў вучыцца ў школе, не слухаўся маці, настаўнікаў. Хацелі накіраваць яго ў дзіцячы дом, адмовіўся пайсці туды. А захацелася яму раптам стаць трактарыстам. Штодня ён прыходзіў да трактара, на якім працаваў былы танкіст, цяпер вядомы ўсёй рэспубліцы механізатар Цярэнцій Радчанка, і стаяў каля яго па некалькі гадзін.

— Што ты, хлопчык, усё стаіш ды маўчыш? Можа, трактарам кіраваць захацеў? — спытаў у яго Цярэнцій.

— А чаму б і не! Хіба толькі вы адны можаце? — адказаў той, апусціўшы чорныя пранікліва вачаняты.

— Дык у чым жа справа? Прыходзь — будзем вучыцца разам і працаваць.

Так пасябравалі два чалавекі: адзін — загартаваны ў паходах былы салдат, другі — яшчэ зусім юны, але дасціпны хлопчык, які захацеў авалодаць тэхнікай.

І вось мінула ўсяго два гады. Гэты хлапчук, якому толькі пятнаццаць год, удвух з Цярэнціем Радчанкам, ужываючы комплексную механізаваную апрацоўку, вырасціў 150 гектараў кукурузы. За поспехі ў працы Валодзя Стаднік, як і яго настаўнік, камуніст Радчанка, узнагароджан залатым медалем «Удзельнік Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі».

Калі я паглядзеў на яго, падумаў: вось такія ў дні вайны станавіліся Матросавымі і Маратамі Казеямі, кідаліся пад танкі і выносілі з палаючых дамоў маленькіх дзяцей. А сёння яны — героі на кукурузных палях, ля такарных станкоў.

І яшчэ я падумаў: якія цудоўныя ў нас людзі! Вось гэты самы Цярэнцій Радчанка! Другі б на яго месцы не звярнуў увагі на маленькага хлопчыка-сірату. А ён заўважыў у яго жаданне вадзіць трактар і навучыў яго кіраваць такой тэхнікай, якую можна даверыць толькі вопытнаму майстру.

Колькі ў нас такіх людзей — добрых, шчырых, працавітых! Яны «гатовы на жыццё, на подзвіг і на смерць» у імя сваёй маці-Радзімы, у імя шчасця чалавека.

З такімі людзьмі — камуністы яны ці беспартыйныя — можна будаваць камунізм. Яны сваімі рукамі ўздымуць светлы будынак, у якім будуць жыць мільёны людзей — самых шчаслівых на свеце.

Мы закладваем сёння падмурак гэтага будынка. А пройдуць гады, некалькі год — і ярка засвецяць яго вокны.

Пятро ПРЫХОДЗЬКА.

КАМУНЫ ДАМЫ ВЫРАСТАЮЦЬ

Мы ў аддзеле планіроўкі і забудовы сельскіх населеных пунктаў Беларускага дзяржаўнага інстытута сельскага будаўніцтва. Нас цікавіць, якой будзе вёска камуністычнага Заўтра.

Начальнік аддзела Іван Трыфанавіч Каробкін знаёміць нас з перспектыўнымі планамі забудовы калгаснага сяла. На праектах сярод мора квітнеючых садоў і зеляніны дэкаратыўных дрэў — роўныя вуліцы, велічныя плошчы, скверы, светлыя і прыгожыя шматкватэрныя жылыя дамы, шматпавярховыя будынкі культурна-бытавых і грамадскіх устаноў...

Цэлы горад! Тут можна знайсці ўсё неабходнае для задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэб людзей.

— Дарэчы, вёска пачынае ўжо расці ў такім напрамку, — заўважае Іван Трыфанавіч і звяртае нашу ўвагу на панарамны фотаздымак населенага пункта гарадскога тыпу. — Вось гэта пабудавана за апошнія гады ў калгасе імя Калініна Нясвіжскага раёна.

А ці ж не горадам-садам стане праз 10—15 год цэнтральная сядзіба саўгаса «Камунар» Гомельскай вобласці? Тут згодна перспектыўнага плана, усе жылыя дамы і грамадскія будынкі двух- і чатырохпавярховыя. У кватэрах прадугледжаны паравое ацяпленне, водаправод, каналізацыя — увогуле ўсе камунальна-бытавыя выгоды. Новая цэнтральная сядзіба саўгаса разлічана на дзве з палавінаю тысячы жыхароў. Усе жывёлагадоўчыя і гаспадарчыя будынкі вынесены за межы населенага пункта.

Галоўны інжынер гэтага праекта Лідзія Ільінічна Жылкіна расказвае, што саўгас «Камунар» паспяхова вядзе забудову сваёй цэнтральнай сядзібы згодна з перспектыўным планам. Сёння ў саўгасе пабудаваны школа-інтэрнат, адзін шаснаццацікватэрны і два васьмікватэрныя дамы для рабочых, дзіцячы сад і іншыя будынкі.

Такая забудова населеных пунктаў па генеральных планах праводзіцца ў вялікіх маштабах калгасамі «17-е верасня» Нясвіжскага раёна, імя Куйбышава Слуцкага раёна, «Новы быт» Мінскага раёна, «Чырвоная змена» і імя БВА Любанскага раёна, саўгасамі «Вейна» Магілёўскага раёна, «Волма» Мінскай вобласці і многімі іншымі.

Характэрна тое, што як індывідуальнае, так і грамадскае будаўніцтва вядзецца ў асноўным па тыпавых праектах. Будаваць навечна, трывала, каб новы дом быў прыгожы, светлы, эканамічна выгадны — вось асноўнае, што цікавіць сельскага заказчыка. Пра гэта клапоціцца і вялікая армія сельскіх зодчых.

Сёлета па заказах калгасаў рэспублікі Беларускі дзяржаўны інстытут сельскага будаўніцтва выканаў 118 тыпавых праектаў дзіцячых садоў, каля ста праектаў чатырохпавярховых жылых дамоў, па якіх ужо распачата будаўніцтва.

Сельскі заказчык аддае перавагу, як правіла, мураваным будынкам.

Інжынеры і архітэктары інстытута распрацавалі таксама серыю адна- і двухкватэрных, чатырох-, шасці- і васьмікватэрных будынкаў. У двухпавярховых жылых дамах кожная кватэра мае пакоі як на першым, так і на другім паверхах.

— Пры вызначэнні перспектыўнай забудовы цэнтральнай сядзібы саўгаса ці калгаса, — расказвае дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута сельскага будаўніцтва Аляксей Якімавіч Калугін, — мы ўлічваем эканамічныя і прыродныя рэсурсы той ці іншай гаспадаркі. Напрыклад, для калгаса, які мае чытыры-пяць тысяч гектараў зямельных угоддзяў (у тым ліку паўтары тысячы гектараў ворыўнай зямлі), вызначаецца для перспектыўнай забудовы адзін населены пункт на паўтары-дзве тысячы чалавек. А для больш буйных гаспадарак апроч цэнтральнай сядзібы прадугледжаны дадатковыя населеныя пункты. Колькасць іх залежыць ад наяўнасці зямельных угоддзяў і гаспадаркі арцелі. Амаль усе калгасы і саўгасы Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей сёння маюць перспектыўныя планы новай забудовы сваіх населеных пунктаў. Больш мацнейшыя гаспадаркі ўжо цяпер распачалі перабудову сваіх пасёлкаў.

Расце новая вёска, вёска камуністычнага Заўтра!

Ал. АЛІН.

Сельскія зодчыя (злева направа) архітэктар К. Вернер, галоўны інжынер Л. Жылкіна і інжынер Л. Васільчук распрацоўваюць праект новай планіроўкі калгаснай вёскі.



Такім горадам-садам на Гомельшчыне стане праз 10—15 год цэнтральная сядзіба саўгаса «Камунар».

Фота Ул. КРУКА.

У ДАПАМОГУ УНІВЕРСІТЭТАМ КУЛЬТУРЫ

Канторы і аддзяленні кінапракату пасылаюць кінаўстаноўкам рэспублікі шмат новых цікавых навукова-папулярных і хранікально-дакументальных кінафільмаў па мастацтву.

Аб творчасці народнага мастака СССР Ул. Сярова апавядае каляровая кінакарціна «Мастак Уладзімір Сяроў».

З цікавасцю будзе прагледжана навукова-папулярная кінакарціна «Крокі сямігодкі», прысвечаная другой усесаюзнай выстаўцы мастацкай фатаграфіі «Сямігодка ў дзеянні». Тут было прадстаўлена каля тысячы работ чатырохсот фотажурналістаў і фотамастакоў.

Каляровы фільм «Помнік Пушкіну», выпускае на экраны краіны Ленінградская студыя навукова-папулярных фільмаў.

«Увага! Пад вадой здымка» — так называецца каляровы хранікальна-дакументальны кінанарыс аб эксперыментальных падводных здымках на Чорным моры кінагрупы «Чалавек-амфібія» (кінастудыя «Ленфільм»).

Р. ЗАЙЦАЎ.

ГЭТАГА МАГЛО НЕ ЗДАРЫЦЦА

Яшчэ некалькі месяцаў назад гэтыя дзяўчаты выходзілі з прахадной фабрыкі весялейшымі за майскую раніцу.

— Марыя, запявай! — гаварылі яны сваёй сяброўцы з карымі вачыма.

І плыла гучная вясёлая песня.

І цяпер дзяўчаты кожны дзень выходзяць з прахадной. Але сярод іх няма Марыі Праліска.

Лепшай работніцы фабрыкі, ударніцы камуністычнай працы няма ў жывых. А ёй бы толькі жыць ды жыць, калі б людзі, да якіх яна звярнулася са сваім горам, дапамаглі хоць бы добрым словам. На жаль, гэтыя людзі былі з халоднымі, чэрствымі душамі.

З маленства лёс не песціў Марыю Праліска Ёй не споўнілася і дванаццаці год, як памерла маці (гэта было ў час нямецкай акупацыі). Праз месяц яшчэ адно няшчасце. Немцы расстралялі бацьку за сувязь з партызанамі, забралі карову, а дом спалілі. Сама Марыя і дзве яе малодшыя сястрычкі ўцалелі цудам — былі ў суседзяў.

Марыя, сама яшчэ дзяўчынка, замяніла сястрычкам маці. Як яны жылі? Знаходзіліся добрыя людзі, якія давалі кусток у доме, кавалак хлеба.

Калі Брэстчына была вызвалена ад фашысцкай навалы, клопаты аб дзяўчатах-сіротах узяла на сябе дзяржава. Ім была прызначана пенсія.

І вось Марыі споўнілася васемнаццаць год. Яна з'ездзіла ў Брэст, даведалася, што на трыкатажнай фабрыцы патрэбны работніцы і праз некалькі дзён стала працаваць там.

Хутка асвоілася яна з новымі абавязкамі, лёгка ўвайшла ў калектыў. На фабрыцы ніхто не падазраваў, што ў гэтай кемлівай і спрытнай дзяўчыны за плячыма такое цяжкае жыццё, што яна жыве на прыватнай кватэры ў невялічкім пакойчыку, выхоўвае дзвюх малодшых сястрычак. Яна нікому не гаварыла пра гэта, не скардзілася на жыццё.

Аднойчы пры чарговым падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва высветлілася, што ў новай работніцы Марыі Праліска амаль рэкордная на фабрыцы выпрацоўка. На Дошцы гонару з'явілася яе фатаграфія.

Марыю запрасілі ў самадзейны хор. Дзяўчыне не трэба было двойчы напамінаць, каб засталася на рэпетыцыі. І, здавалася, што заўсёды ёй весела, як усім, і лёгка, як усім.

Толькі аднойчы, калі спявалі песню пра дзявочы смутак, ёй здалося, што песня гэта складзена пра яе горкае каханне, і Марыя ціха выйшла за кулісы маленькай клубнай сцэны, прысела там на крэсла і залілася горкімі слязьмі.

Але, калі хор закончыў песню, дзяўчына ўзяла сябе ў рукі, усяляк стараючыся не выдаць свайго хвалявання.

На фабрыцы Марыя па-ранейшаму працавала так, што партрэт яе ўвесь час знаходзіўся на Дошцы гонару. Актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці калектыву. А калі разгарнулася спаборніцтва за званне ўдарніка камуністычнай працы, яна пачала працаваць яшчэ больш старанна. Дзіву даешся, адкуль чэрпала сілы гэтая сапраўды нястомная дзяўчына. Ёй жа ў гэты час было вельмі цяжка. Раней, калі былі маленькія сястрычкі, у яе не хапала часу думаць пра асабістае жыццё, усё адкладала на «потым». Пасля работы трэба было пахадзіць па магазінах, а потым згатаваць вячэру, памыць бялізну, папрасаваць... Нылі рукі, зліпаліся вочы, але яна не наракала. Трэба, яна старэйшая... Толькі, як падраслі сёстры, можна было падумаць і пра асабістае жыццё. І вось прыйшло гэтае «потым», здалося, яна сустрэла таго, пра каго марыла. Гэтым «ідэалам» аказаўся Уладзімір Астапковіч.

Амаль год яны сустракаліся. Але не зразумела не разгадала своечасова дзяўчына Уладзіміра Астапковіча, яго нізкую, агідную душу. Ганна Дзям'янаўна Кулага, гаспадыня кватэры, дзе шэсць год жыла Марыя Праліска, расказвае пра тое, як амаль кожны дзень прыходзіў у яе дом Уладзімір, як кляўся ў каханні Марыі. А аказалася, што ўсе яго прыгожыя словы — хлусня

— А як кахала яго Марыя, — гаворыць Ганна Дзям'янаўна. — Неяк я прачнулася ноччу. У пакоі Марыі гарыць святло. Што ж гэта яна робіць? Заходжу да яе ў пакой. Марыя сядзіць, вышывае кашулю. А Уладзімір ляжыць на ложку. Я здзівілася, такая сціплая, строгая дзяўчына і раптам... «Заўтра, Ганна Дзям'янаўна, мы ў ЗАГС ідзём,—сказала Марыя.— Вось пашпарт Валодзеў... А гэта я яму кашулю вышываю... Да вяселля...»

— Я хацела пабудзіць Валодзю, — расказвае далей Ганна Дзям'янаўна, — але Марыя не дазволіла. «Не трэба, ужо вельмі ён соладка спіць...» На наступны дзень яны сходзілі ў ЗАГС, пакінулі заяву. Як прынята ў такіх выпадках, Марыю павіншавала я, суседзі. Праўда, Валодзя ў той дзень не з'явіўся да нас. Не было яго і потым Не прыйшоў ён у прызначаны час у ЗАГС. «Можа, з ім здарылася няшчасце?» — падумалі мы.

Марыя едзе на Раманаўскія хутары, дзе працаваў Валодзя экскаватаршчыкам Чарнавіцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення. Ён заўважыў яе і схаваўся, а хлопцаў папрасіў сказаць, што вельмі хворы, ляжыць у бацькоў у вёсцы Задвор'е Камянецкага раёна.

У той жа дзень Марыя ідзе на фабрыку, просіць дазволу і едзе ў Задвор'е.

Дома яго не аказалася. Праўда, Марыя з гутаркі з бацькамі Валодзі зразумела што гаворка пра яе тут ужо была У дзяўчыны пыталіся, колькі яна зарабляе, ці ёсць у яе грошы, пасаг...

А між тым час ішоў, Марыя адчула, што ў яе будзе дзіця. Што рабіць? Трэба абавязкова знайсці Валодзю, расказаць яму пра гэта.

Сустрэча адбылася. Яна не прынесла радасці.

— Мяне гэта не датычыць, — адрэзаў Астапковіч.

Марыя жахнулася:

— Валодзя, ці ты гэта?..

— Прэч адсюль зараз жа! — пачула яна ў адказ.

У Марыі пацямнела ў вачах.

Чалавек, які нядаўна кляўся ў каханні, ударыў яе і пайшоў прэч. Ён баяўся, каб Марыя, што фактычна была ўжо яго жонкай, не сустрэлася з другой дзяўчынай, якую ён чакаў.

Другой была Таісія Іванаўна Рабчук, настаўніца пачатковай школы ў Раманаўскіх хутарах.

Калі гавораць пра настаўніка, дык уяўленне малюе вобраз добрага, сардэчнага чалавека, які ветліва сустракае на школьным парозе сямігадовае дзіця і вядзе яго ў жыццё, аддае яму розум, душу, сэрца... Якая далёкая ад гэтага Таісія Рабчук. Не тады, а крыху пазней, але сустрэлася з ёю Марыя, расказала пра ўсё сваё жыццё, пра Уладзіміра, які ашукаў яе, горка плакала. Таісія нават не захацела слухаць яе. На няшчасці іншага Рабчук думае пабудаваць сваё шчасце. Як усё гэта брыдка!

...Марыя вярнулася дадому. А тут яе ўжо чакаў участковы міліцыянер Данілевіч. Аказваецца, Уладзімір Астапковіч напісаў у Брэсцкі гарадскі аддзел міліцыі заяву аб тым, што Марыя... украла ў яго пашпарт...

Участковы міліцыянер, выслухаўшы тлумачэнні Марыі, сказаў коратка:

— Вось вам, грамадзянка, позва. Заўтра з'явіцеся ў гарадскі аддзел міліцыі да падпалкоўніка Ютковіча.

Мы будзем гаварыць пра падпалкоўніка міліцыі не як пра службовую асобу, а проста як пра чалавека, умудронага жыццёвым вопытам. Здавалася, што лёс ашуканай дзяўчыны-сіраты, у якой за плячыма такое цяжкае жыццё, усхвалюе яго, ён праявіць аб ёй бацькоўскі клопат. На жаль, падпалкоўнік міліцыі аказаўся чалавекам з чэрствай душой, чыноўнікам.

Вось якія паказанні даваў потым на судзе ўчастковы міліцыянер Данілевіч: «Праліска расказала ўсё падпалкоўніку, плакала пры гэтым. Мы сказалі, няхай Праліска за пабоі падасць у суд. На гэтым і разышліся, а на наступны дзень пачулі, што яна атруцілася».

Работнікі міліцыі лічаць, што іх сумленне чыстае. Яны параілі Марыі звярнуцца ў суд.

Ці так гэта? Ці чыстае іх сумленне? Не! Яны маглі як след пагаварыць з Астапковічам, яго бацькамі, кіраўнікамі Чарнавіцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення, пагаварыць аб сумленні савецкага чалавека, аб нашай савецкай маралі. Маглі, але не знайшлі патрэбным. І вось канец. Сумны, страшны... Марыя пакончыла жыццё самагубствам.

Перад тым, як пайсці на гэта, яна была ў начальніка Чарнавіцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення тав. Жыдко. Як сустрэў Марыю тав. Жыдко, невядома. Але тое, што ён сказаў аўтару гэтых радкоў, не да твару не толькі кіраўніку савецкай установы, а чалавеку наогул На пытанні пра Астапковіча ён адказаў:

— Работнік добры.

— А як чалавек, як ён паводзіць сябе пасля работы? — пытаемся.

— Гэта мяне не датычыць, — чуецца адказ тав. Жыдко. — Пасля работы няхай хоць на галаве ходзіць(!?)

Вось вам тып яшчэ аднаго, не менш небяспечнага чыноўніка.

Вядома, учынку Марыі нельга апраўдаць Але зрабіла яна гэта ў хвіліны роспачы. Яе трэба было маральна падтрымаць, ды не было каму.

Па настаянню калектыву трыкатажнай фабрыкі адбыўся суд. Брэсцкі гарадскі суд, скажам прама, вынес Астапковічу мяккую меру пакарання — год турэмнага зняволення. Такім прысудам абурыліся прысутныя ў зале, увесь калектыў трыкатажнай фабрыкі, пракурор горада. Пракурор вынес пратэст.

Напісаў скаргу і Астапковіч.

І вось новы прыгавор. Калегія Брэсцкага абласнога суда пад старшынствам тав. Нічыпаровіча... апраўдвае Астапковіча.

Бяспрэчна, у судовай практыцы бываюць цяжкія справы, сустракаюцца вельмі складаныя акалічнасці, у якіх часам вельмі цяжка разабрацца. Але ў дадзеным выпадку памыліцца нельга, тут усё ясна. Цяжкая віна Астапковіча. Але ён па літасці брэсцкіх суддзяў на свабодзе. І, вядома, не адчуваюць дакораў сумлення людзі з халоднай каменнай душой, да якіх звярталася Марыя і прасіла дапамогі.

Вось якая сумная гісторыя здарылася ў Брэсце. І ўсё ж наш расказ пра яе не мае канца. Ён не дае адказу на пытанні калектыву Брэсцкай трыкатажнай фабрыкі, які не можа прымірыцца з абуральнай несправядлівасцю. У пісьме да пракурора, пад якім стаіць 150 подпісаў, гаворыцца: «Мы не можам дазволіць, каб у нашай краіне, краіне справядлівасці і праўды, маглі беспакарана жыць людзі, падобныя да Астапковіча, і рабіць такія злачынствы».

М. ПІНЧУК.

ЗАЎСЁДЫ З МАЛАДЫМ СЭРЦАМ

Віншуючы летась з 60-годдзем Уладзіміра Дубоўку — аднаго са старэйшых пісьменнікаў рэспублікі— Васіль Вітка пісаў: «Паэт не мае права старэць — у гэтым яго шчасце. Колькі б ні было яму гадоў, сэрца паэта заўсёды застаецца маладым, здольным разумець і перажываць радасць маладосці». І гэта не абстрактная юбілейная сентэнцыя, а лагічны вывад, што вынікае з творчай практыкі ўсіх савецкіх майстроў мастацкага слова, у тым ліку і таленавітага беларускага лірыка. Менавіта нязгаснае душэўнае гарэнне, пастаянная вострая зацікаўленасць жыццём і яго разнастайнымі праявамі, прага заўсёды ісці наперад, у нязведаныя далі, вось ужо колькі дзесяцігоддзяў натхняе пранікнёную ліру паэта. Гэта быў нялёгкі шлях пошукаў вялікай жыццёвай і мастацкай праўды, пошукаў свайго месца ў навакольнай рэчаіснасці, у агульнанароднай барацьбе за светлыя ідэалы будучыні. Шлях той пачынаўся для паэта ў суровыя, поўныя рэвалюцыйнай рамантыкі дваццатыя гады і атрымаў канкрэтнае мастацкае выяўленне ў творах, якія ўвайшлі пасля ў яго зборнікі—«Строма» (1923) і «Трысцё» (1925), «Там, дзе кіпарысы», «Credo» (1926), у паэмах «Наля», «Браніслава» (1927—1929) і г. д.

Пафас тых незабыўных дзён, калі будаваўся сацыялізм, калі мільёны савецкіх людзей паступова мянялі аблічча зямлі, Уладзімір Дубоўка пранёс праз многія гады, захаваўшы пры гэтым свежасць успрыймання навакольнага свету і чалавечых узаемаадносін. Калі знаёмішся з яго новай кнігай паэзіі— «Палеская рапсодыя», дык міжвольна адчуваеш, як горача і мужна б'ецца сэрца паэта, як па-ранейшаму молада ўслаўляе ён радасць і красу жыцця, неўміручыя подзвігі герояў Айчыннай вайны, працоўны гераізм народа — будаўніка камуністычнага грамадства. У гэтым няспынным імкненні спяваць песні новаму чалавеку і яго справам, бадай, і заключаецца самая адметная рыса творчасці паэта.

Вітаю ўсіх я шчырым сэрцам,
стаяць на месцы хто не хоча,
хто ў далі новыя імкнецца,
хто сцежкі новыя ўсё топча! —

усклікае лірычны герой верша «Цяпер не ў песнях, а на яве». І мы добра ўяўляем няўрымслівую, заўсёды дапытлівую і неспакойную натуру волата, для якога жыццё — гэта безупынны рух наперад, туды, дзе «працы творчае ўзлёты» паўстаюць перад сучаснікам ва ўсёй сваёй «чароўнай сіле» і харастве.

Прыгожы душою і справамі, герой паэта праходзіць па роднай зямлі, пакідаючы нашчадкам плён працы рук нястомных, умелых. Гэта ён закладае «масты для вялікіх дарог, каб скрануць іх ніхто і ніколі не мог» («Бацькаў наказ»), і ўзводзіць гмах буйнейшага ў Беларусі хімічнага камбіната, што «пасведчыць у стагоддзях» аб тытанічных намаганнях людзей, якія ішлі «да камунізма грамадой усёй вялікай».

Паэт імкнецца ў сваёй творчасці даць шырокую карціну жыцця рэспублікі, раскрыць адметныя рысы эпохі, унутраны свет піянераў велічных творчых здзяйсненняў. Гістарычная значнасць падзей, якія на нашых вачах перажылі людское жыццё самых глухіх у мінулым куткоў краіны, лягла ў аснову большасці вершаў зборніка. Аб чым бы ні пісаў паэт, ён звычайна не бывае раўнадушным і спакойным: ці будуць гэта невялічкія мініяцюры.—«Выдатна, — кажа майстар, — малайчына!» і «Завяршылі мур» — аб спраўных, улюбёных у сваю працу мулярах; ці светлая народная казка «Матчына парада», дзе простая жанчына раскрывае сыну «сакрэт», як трэба выбіраць нявесту; ці мужная песня аб гадах, што адляцелі ўдаль — «Сябрам маладосці»; ці прачулы, цёплы сказ аб непаўторнай красе роднага краю — «Усход сонца на Прыпяці». Пад аўтарскім пяром як бы ажываюць, налёваюцца яркімі фарбамі, напаўняюцца глыбокім зместам малюнкі з далёкага мінулага, гераічныя справы Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенных гадоў.

Народ бессмяротны, як бессмяротны і яго дзеянні на славу Радзімы, — такой думкай пранізаны лепшыя творы «Палескай рапсодыі». У вершы «Голас партызана» — суровай і мужнай споведзі народнага мсціўца — Уладзімір Дубоўка ўслаўляе бяспрыкладную самаахвярнасць шасцярых воінаў, слава пра чый подзвіг заўсёды крылатай птушкай будзе лунаць над зямлёю. Мы чуем упэўнена-спакойны голас загінуўшага героя, які нават у смерці сваёй бачыць трыумф пераможцы:

Зарос курган густой травой.
Над ім няспынны шум дубоў.
Знайшлі тут вечны супакой
і я, і шэсць маіх сяброў.
Кароткі мелі мы загад:
— Стаяць, каб вораг не
прайшоў!
Не адступілі мы назад —
ні я, ні шэсць маіх сяброў...
Хоць мы ляжалі далавах,
хоць не маглі мы стаць ізноў,—
сцісканай зброю мы ў руках —
і я, і шэсць маіх сяброў.

Размерана скупое, простае ў сваёй суровасці «і я, і шэсць маіх сяброў» як бы падкрэслівае ўрачыстасць тае незабыўнае хвіліны, калі сілы дабра і справядлівасці ўзялі верх над чорным злом. І нібы своеасаблівым апафеозам неўміручасці справы, за якую зложылі галовы юнакі, нібы светлым запаветам наступным пакаленням гучаць заключныя словы байца-партызана: «Калі айчына клікне вас, — не дайце ворагу шляхоў, як не давалі мы ў той час — і я, і шэсць маіх сяброў...»

Паэт па-свойму стараецца асэнсаваць незвычайны аптымізм сваіх герояў і даць яго мастацкае вытлумачэнне. Але трэба сказаць і аб адваротным. Убачанае і перажытае пісьменнікам у яго падарожжы па дарогах жыцця настолькі велічнае і грандыёзнае, што іншы раз аўтару быццам бы не хапае патрэбных слоў для сакавіта-вобразнага паказу вялікіх ідэй нашага часу. І тады адчуваеш пратакольную сухасць, своеасаблівую скорагаворку ў зарыфмаваных інфармацыях аб тых ці іншых падзеях і ўражаннях. Паэт толькі закранае, а не раскрывае па-мастацку глыбока і пранікнёна тэму, характар свайго героя. Узяць хоць бы сакратара райкома з аднайменнага верша. «Установачныя» дадзеныя: «Ён малады, ды стары. Пабачыў ён багата. Пакутаваў нямала. Пабыў ён і салдатам. Цярпеў ён голад, сцюжу. Чаго там не цярпеў ён!» і г. д. — не вышік вобразнага мыслення, а хутчэй нейкія, як бы «абавязковыя» біяграфічныя даваўкі да жыццяпісу героя, які сапраўды паспеў ужо ўдосталь глынуць горычы на сваім вяку. Яшчэ даведваемся, што ён — сардэчны, чулы таварыш, які ахвотна «сухар апошні дзяліў у час нягоды», што ён любіць людзей і ўсякі, хто захоча пагутарыць з сакратаром, заўсёды знойдзе яго «на фабрыцы, на пожні» ў акружэнні працаўнікоў горада ці вёскі.

Ёсць словы, ёсць рыфмы, ёсць думкі... Знешне, здаецца, усё на месцы. Перад намі верш. Але ці выклікае ён душэўнае хваляванне, ці кранае нас сапраўды мастацкай распрацоўкай узнятай тэмы? Ці бачым мы героя твора з усёй яго сардэчнай шчырасцю і прастатою? Не! З-пад пяра аўтара выйшаў не жывы, адухоўлены вялікімі ідэямі, адчувальны герой сённяшняга дня, а толькі агульны літаратурны накід яго, з загадзя абумоўленымі рысамі знешнасці і характару. Пісьменніцкая задума — паказаць у мастацкім творы раённага важака мас — у дадзеным выпадку нерэалізавана.

Наўрад ці застанецца ў памяці або выкліча душэўныя зрухі ў чытача і верш «Вясёлы капітан». На нашу думку, у ім аналагічныя недахопы: той жа «бакавы» позірк на чалавека, здымак на адлегласці. Пратакольная аснова не абрасла мастацкай тканінай, не налілася жыватворнымі сокамі сапраўднай паэзіі... «Круты разварот. Адышоў цеплаход. На палубе марш заігралі. Ён з музыкай возіць заўсёды народ, — каб не сумавалі. Ідзе капітан. Аглядае ўсё сам. На вуснах — сардэнныя словы. На мосцік прайшоў. Прывітаў караван: — Таварыш, здарова! Ідзе цеплаход. Не сумуе народ. На палубе песні і маршы. З такім можна смела на працу, у паход: надзейны таварыш!». Як бачым, тры страфы, свядома напісаныя ў адзін радок, адразу знялі пытанне аб паэтычнай, вобразнай структуры верша. Перад намі ўзор лапідарнай прозы, якая нагадвае звычайны тэлеграфны тэкст. Парушыўшы спецыфіку паэзіі, аўтар разам з тым разбурыў і мастацкую гармонію карціны, якая, напэўна, уяўлялася яму, калі ён глядзеў на энергічнага і прыветлівага камандзіра карабля ў часе вясёлага і прыемнага падарожжа. Адсюль і выпадковыя, бляклыя словы-вобразы, слабая ўзаемасувязь паасобных малюнкаў, іх бедная эмацыянальная насычанасць.

Некаторыя вершы зборніка нямала трацяць і ад таго, што напісаны яны з прычыны чыста мімалётнай, а не ў выніку ўнутранай патрэбы і глыбокага роздуму над той ці іншай жыццёвай з'явай, фактам. Не ўсё, што мы бачым вакол сябе, з чым сутыкаемся, можа або павінна стаць здабыткам паэта. Плённая практыка лепшых майстроў слова не раз пацвярджала агульнавядомую ісціну, што сапраўдная паэзія адкрываецца там, дзе ў мастацкіх вобразах раскрываецца асоба чалавека, дзе выяўляецца ўласцівы яму творчы пачатак, яго вялікае сэрца. І наадварот, наўрад ці пойдзе ў актыў паэта гладка зарыфмаваныя, але бедныя па думцы наборы строф, у аснове якіх ляжаць малазначныя, «невыпакутаваныя сэрцам» пачуцці і ўражанні. Тыповымі ў гэтых адносінах можна назваць вершаваныя радкі, аб'яднаныя загалоўкамі: «Шофер таксі пасажыраў чакае», «На аўтобусным вакзале ў Кобрыне» і інш. Ні шофер таксі, ні красуня, якая прыглянулася хлопцу і тым самым вымусіла яго ўзяцца за аловак, каб той намаляваў яе прыгожую галоўку; ні маці, што купіла за прададзеных шчупакоў тры кніжкі сыну, не зрабіліся аб'ектам належнай аўтарскай развагі, не сталі вострай мастацкай патрэбаю і таму, вядома, не сталі паэтычным здабыткам аўтара.

Лепшыя творы «Палескай рапсодыі», а іх нямала, вылучаюцца перш за ўсё выключнай, калі можна так сказаць, «рухавасцю» лірычнага героя, яго гарачай зацікаўленасцю ўсім, чым жыве сёння савецкі працаўнік, чым заняты яго розум і сэрца. Бадзёрая, глыбокапранікнёная вера ў радасць і чалавечае шчасце, у вялікую стваральную сілу нашага грамадства неадступна спадарожнічае яму праз усе гады. І веру гэтую нішто не пахіснула. Паранейшаму ён мужна пазірае наперад. «Дарма, што палыны знянацку мне ўсерабрылі бараду, усё ж ткі я хадой юнацкай, а не абы-якой іду»,— упэўнена кажа ён, і мы верым, што менавіта юнацкі запал, а не абывацельская самазаспакоенасць, смеласць і рашучасць, а не раўнадушнасць і абыякавасць, палымяныя маладыя пачуцці, а не іх сурагаты вызначалі ўвесь яго жыццёвы шлях. І тут жа дадае: «Імпэт юнацкі нас не кіне аж да апошніх нашых дзён; мы нарадзіліся такімі, такімі свой спаткаем скон» («Уладзіміру Сасюру»). Чалавек з яго невычарпальнымі магчымасцямі пераўтвараць навакольны свет стаіць у паэта заўсёды на першым плане. Ён міккі і добры ў хвіліны душэўнай радасці, настойлівы і рашучы ў дасягненні пастаўленай мэты, смелы і самаахвярны ў часе небяспекі для Радзімы. Мастак у захапленні ад яго душэўнай і фізічнай красы, светлых парываннй і цудоўных спраў. Лірычны герой верша «Сешненская Алеся» ў глыбокім радасным задуменні адзначае: «Як многа ў маёй айчыне пекнаты» і, нібы адказваючы на пытанне — адкуль яна гэтая пекната? — кажа да прыгажуні Алесі і яе сяброў: «...Уся, што тут у наваколлі ёсць, ад вашай шчырай працы...»

«Палеская рапсодыя» ў лепшай частцы сваёй уяўляецца чытачу цёплай і шчырай песняй аб непаўторнай прыгажосці беларускага краю—таямніча гаманкіх пушчах і сіне-сініх крынічных азёрах, аксамітна-зялёных пахкіх лугах і ўсыпаным залацістым зоркамі бяздонным жнівеньскім небе. Паэт улюбёны ў навакольныя прасторы і вельмі тонка адчувае іх пастаянна зменлівыя фарбы. Не, «ніяк не прыдумаць... ні гэтых прастораў, ні Прыпяць другую, ні гэтых убораў квяцістых і пышных», —іх трэба толькі бачыць («Ноч на Прыпяці і казка пра зоркі»). Незвычайнаму хараставу роднай зямлі мастак прысвяціў нямала прачулых радкоў і ў сваіх ранніх, памянёных вышэй кнігах. З гадамі ж гэтыя адчуванні сталі яшчэ больш цёплымі і пранікнёнымі, заігралі новымі адценнямі. Чытаеш такія вершы, як «Усход сонца на Прыпяці», «Кветкі—сонцавы дзеткі», і пераконваешся, што талент паэта-лірыка, песняра роднай прыроды па-ранейшаму свежы і багаты.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ШЧАСЛІВАГА ПАДАРОЖЖА!

Дзяржаўны ансамбль танца Беларускай ССР выязджае ў сваё першае зарубежнае гастрольнае падарожжа ў Чэхаславацкую Сацыялістычную Рэспубліку. Ён прыме ўдзел у месячніку чэхаславацка-савецкай дружбы.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам мастацкі кіраўнік ансамбля, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Апанасенка расказаў:

— Цяпер, пасля канцэртаў у Маскве перад дэлегатамі XXII з'езда партыі, дзе артысты ансамбля выступалі з вялікім творчым уздымам, мы паедзем да нашых чэхаславацкіх сяброў. Гэта вялікі гонар прадстаўляць беларускае савецкае мастацтва за рубяжом. Мы старанна рыхтаваліся да гэтых гастролей. Дырыжор аркестра Г. Алоўнікаў інструментаваў большую частку музычных твораў, якія суправаджаюць танцавальныя нумары. Чэхаславацкім гледачам пакажам беларускія танцы «Лявоніху», «Бычок», «Лянок», харэаграфічную карцінку «На птушкаферме», «Беларускую рапсодыю» і «Маладзёжную сюіту». У праграме калектыву ёсць і новыя работы—беларускія танцы «Бульба», «Свята ўраджаю», а таксама танцы народаў СССР і краін народнай дэмакратыі. У выступленнях ансамбля прыме ўдзел лаўрэат VI Сусветнага фестывалю моладзі цымбаліст В. Бурковіч. Аркестр ансамбля выканае «Славянскі танец № 8» А. Дворжака.

Беларускія артысты выступяць у гарадах: Кошыцы, Банска-Быстрыца, Нітра, Трнава, Брно, Астрава, Готвальдаў, Браціслава, Усці, Прага і інш.

У час гастролей у Чэхаславакіі беларускія танцоры сустрэнуцца з творчымі калектывамі, пазнаёмяцца з выдатнымі мясцінамі і гістарычнымі помнікамі Чэхаславакіі.

Выйшлі з друку

У Дзяржвыдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай і дзіцячай літаратуры:

Піпіп Пестрак. Сустрэнемся на барыкадах. Мастак П. Калінін. Тыраж 2 200 экз., стар. 848. Цана 1 руб. 87 кап.

Рыгор Бярозкін. Спадарожніца часу. Мастак І. Славянін. Тыраж 3 755 экз., стар. 284. Цана 82 кап.

Леанід Гаўрылаў. Вернасць. Вершы. Прадмова К. Кірэенкі. Мастак М. Шырокаў. Тыраж 2 400 экз., стар. 104. Цана 8 кап.

Ганна Новік. Мае вёсны. Вершы. Прадмова П. Пестрака. Мастак І. Ігнаценка. Тыраж 1 730 экз., стар. 36. Цана 4 кап.

Натан Палянскі. Далёка ад Радзімы. Аповесць. На рускай мове. Мастак Э. Гусейнаў. Тыраж 60 000 экз., стар. 212. Цана 44 кап.

Уладзіслаў Махэек. Рапарт не будзе пасланы. Раман. Мастак П. Драчоў. Тыраж 4 150 экз., стар. 352. Цана 55 кап.

Эвальд Вілкс. Чалавек нарадзіўся. Апавяданні. Пераклад з латышскай мовы М. Арочкі. Вокладка М. Гуціева і Л. Прагіна. Тыраж 2 200 экз., стар. 244. Цана 36 кап.

Крум Грыгораў. Танча з Гарацвета. Аповесць. Пераклад з балгарскай мовы В. Нікіфаровіча. Мастак Е. Лось. Тыраж 2 125 экз., стар. 196. Цана 23 кап.

Марк Твэн. Жанна д'Арк. На рускай мове. Пераклад з англійскай мовы Я. Семяжона і Н. Цімафеевай пад рэдакцыяй Ю. Гаўрука. Прадмова Д. Фактаровіча. Мастак В. Басаў. Тыраж 100 тыс. экз., стар. 448. Цана 83 кап.

Новая танцавальная пастаноўка «Свята ўраджаю» ў выкананні ансамбля танца.

Фота Ул. КРУКА.

Сярод кніг

АДРАСАВАНА САМАДЗЕЙНАМУ АРТЫСТУ

Беларуская літаратура не надта багатая на творы драматургіі малых форм. Аўтараў, якія працавалі б выключна ў гэтым, можна сказаць, цяжкім і складаным жанры, у нас амаль няма. Самадзейныя артысты лічаць вялікай падзеяй, калі за ўвесь год з'яўляюцца адзін-два зборнікі аднаактовых п'ес. Звычайна гэтыя кніжкі невялікія па памерах. У кожнай з іх не больш чатырох-шасці твораў.

Зусім нядаўна Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла ў свет такі зборнік камедый і скетчаў Эдуарда Валасевіча «З хворай галавы на здаровую».

З драматургіяй Э. Валасевіча самадзейныя артысты знаёмяцца не ўпершыню. У сельскіх драмтычных гуртках ішлі і ідуць яго камедыі «З хворай галавы на здаровую», «З носам», «Цуд», скетчы «Кулінарыя жыцця» і «Свет клінам не сышоўся». У свой час гэтыя творы друкаваліся на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў. Цяпер аўтар іх выдаў у новай рэдакцыі асобнай кніжкай.

Тэматыка твораў разнастайная і надзённая. Аўтар трапна высмейвае розных майстроў прыпісак і ашуканства, аматараў лёгкай нажывы і беларучак, самагоншчыкаў і п'яніц, бюракратаў і прапаведнікаў рэлігійнага дурману. Пад вострае сатырычнае пяро трапляе ўсё агіднае і брыдкае, што часам яшчэ сустракаецца ў нашай рэчаіснасці.

Герой камедыі «З хворай галавы на здаровую»—старшыня калгаса Бульба папаўся «на вудачку» махляра і прайдзісвета Васьмёркіна, які працуе рахункаводам. Употай ад калгаснікаў у арцелі быў створаны «рэзерв» кароў, за кошт якога перавыконваліся планы надояў малака і продажу мяса дзяржаве. Васьмёркін «зразаў» лік працадзён, каб толькі «на кожны з іх выпадала больш вагі». Цікава разгортваюцца драматургічныя сітуацыі камедыі. Ход усіх падзей твора правільна падказвае аўтару ў фінале пайсці па шляху самарыкрыцця ашукаццаў і майстроў прыпісак. Аднак пры канчатковым вырашэнні канфлікту аўтар як бы абяссілеў і кліча на дапамогу міліцыю. Амаль пад заслону ў кантору калгаса ўваходзіць ахоўнік закона і звяртаецца да прысутных: «Хто тут Васьмёркін?» «Ну, скажам, я, а што?»— збянтэжана адказвае прайдзісвет. «Вы арыштаваны. Даўно мы вас шукалі...»—заключае міліцыянер.

Навошта было дзеля гэтых дзвюх-трох рэплік уводзіць у камедыю новага героя? Самадзейным артыстам гэта дасць толькі лішні клопат: спатрэбіцца яшчэ адзін выканаўца ролі і для яго адпаведны касцюм. Тым больш, што фінал са з'яўленнем міліцыянера не абгрунтаваны ўсім ходам падзей. У канцы п'есы аўтару трэба было больш паглыбіць канфлікт паміж старшынёй арцелі, што вырашыў «пакаяцца ва ўсіх грахах» перад калгаснікамі, і рахункаводам Васьмёркіным, які спрабуе пайсці на шантаж. Вось тады б у развязцы канфлікту была б праўда.

У творчасці амаль кожнага аўтара, які хоць час ад часу звяртаецца да драматургіі малых форм, можна знайсці аднаактовую п'есу, канфлікт якой прыкладна наступны. Ён, станоўчы герой п'есы, цвёрда вырашае ехаць працаваць у вёску. Яна, яго жонка ці нявеста, звычайна—мяшчанка, не хоча расставацца з гарадской кватэрай. Адны з гэтых п'ес, пабудаваныя на шаблонных і надуманых сітуацыях, зусім не ўбачылі сцэны. Другія, больш-менш пасрэдныя, без асаблівага поспеху прайшлі ў гуртках мастацкай самадзейнасці. Камедыі Эдуарда Валасевіча на гэтую тэму «З носам» больш пашанцавала. Яе і сёння сустрэнеш у рэпертуары самадзейных артыстаў.

Чым вабіць гэты твор гледача?

Аўтар хоць і кладзе ў аснову камедыі не новы канфлікт, аднак вырашае яго сваімі мастацкімі сродкамі. У творы Э. Валасевіча сустрэнеш і нечаканую камедыйную сітуацыю, і трапную рэпліку, і песеньку ды прыпеўку, і характэрныя прозвішчы і імёны дзеючых асоб. Напрыклад, жанчына лёгкіх паводзін, беларучка і мяшчанка Прузына Нічыпараўна Круціла патрабуе, каб яе называлі Псіхея Напалеонаўна Круціло. «Вось гэта—шык!—заяўляе яна.— Псіхея Напалеонаўна! Круціло!.. Нешта ад французскага...» Каб твор з яшчэ большай сілай выкрываў пошласць і мяшчанства, аўтар, апроч галоўных герояў Язэпа і Прузыны, увёў у камедыю яшчэ дзвюх дзеючых асоб—чалавека без пэўных заняткаў Паўлюка Антонавіча, які, падобна да Прузыны, называе сябе Апалонам Антуанавічам Свістуновым-Бянгальскім, і прыстойную дзяўчыну —пляменніцу Прузыны Лену. Усё гэта дапамагло аўтару завастрыць драматычныя сітуацыі.

У такім жа вострым сатырычным плане напісана і камедыя «Цуд». Аўтар у ёй выкрывае царкоўнікаў-махляроў, паказвае, што ніякіх «святых пудаў» у жыцці і прыродзе не бывае.

Эдуарду Валасевічу менш удалися скетчы. Надуманая сітуацыя ў скетчы «Кулінарыя жыцця». Бэла і Повар, героі гэтага твора, ужо не маладыя людзі. Ім, як заўважае аўтар у рэмарцы, «пад сорак год» кожнаму. Героі ў пачатку твора зусім незнаёмыя. Яны сустракаюцца выпадкова ў кабінеце ўрача санаторыя. І праз некалькі мінут адбываецца паміж імі наступная размова:

«ПОВАР. ...Мне хочацца набрацца смеласці і прапанаваць вам сваю руку і сэрца...

БЭЛА ЛЬВОЎНА. Па шчырасці кажучы, і вы мне да спадобы прыйшліся... Куды ж мы цяпер?

ПОВАР. Хоць на край свету!

БЭЛА ЛЬВОЎНА. Навошта так далёка? Лепш у ЗАГС!

ПОВАР. ...Ну, у ЗАГС дык у ЗАГС. Згода!»

Другі скетч Э. Валасевіча «Свет клінам не сышоўся» цяжка паставіць на самадзейнай сцэне. Ён з дзвюх карцін і патрабуе складаных дэкарацый: у першай дзеянне адбываецца ў кабінеце бухгалтара райфінаддзела, у другой — у парку культуры.

Э. Валасевіч добра ведае мову людзей, пра якіх піша, умела карыстаецца трапным народным словам. Калі ён бярэ прыказку ці прымаўку, дык па-свойму яе пераасэнсоўвае. Вось, напр

ВЯЛІКІ СЫН ВЯЛІКАГА НАРОДА

Для пользы общества коль радостно трудиться!

М. В. ЛАМАНОСАЎ.

Без перавелічэнняў можна сказаць, што Ламаносаў быў вучоным у паэзіі і мастацтве, паэтам і мастаком у навуцы.

С. І. ВАВІЛАЎ.

ПЕРШЫ НАШ УНІВЕРСІТЭТ

Бялінскі, прасочваючы ў сваім першым вялікім артыкуле «Літаратурныя мары» ход развіцця рускай літаратуры, пачынаючы ад часоў пятроўскіх ператварэнняў, прывёў цудоўнае выказванне Марлінскага пра першага вялікага рускага вучонага і літаратара: на берагах Ледавітага мора, падобна да паўночнага ззяння, засвяціўся Ламаносаў. У рэцэнзіі на твор К. Палявога «Міхаіл Васільевіч Ламаносаў», натхнёна і ярка намаляваўшы вобраз геніяльнага рускага юнака, што імкнуўся да ведаў «у тую эпоху жыцця Расіі, калі пісьменных людзей можна было пералічыць па пальцах, калі вучэнне было чымсьці тоесамным са знахарствам, калі кніга была рэдкасцю і неацэнным скарбам», Бялінскі некалькімі словамі выказаў увесь глыбокі сэнс дзейнасці Ламаносава: «Усё жыццё яго было цудоўным подзвігам, бесперапыннай барацьбою, бесперапыннаю перамогаю... Ці не ёсць Ламаносаў адна з самых яркіх народных слаў?.. Вучоны, паэт і літаратар, не з выпадку, а па прызванню, ён пераадолеў тысячы перашкод і праз усё жыццё застаўся чалавекам, вучоным працаўніком, а не зрабіўся, калі ўсміхнулася яму мірскае шчасце, вяльможаю, знатным панам...» І сапраўды, жыццё і творчасць Ламаносава — выключная з'ява для прыгонніцкай Расіі XVIII стагоддзя, калі прывілеямі на асвету карысталіся пераважна духавенства і дваранства. Ламаносаву — выхадцу з сялян, паводле справядлівай заўвагі Г. Пляханава, «надзвычайна дапамагла тая акалічнасць, што ён быў, менавіта, **архангельскім** мужыком, **мужыком-паморцам**, які не насіў прыгонніцкага нашыйніка». Тым не менш, і Ламаносаву нямала давялося перашкод пераадолець на шляху да ведаў. І перашкоды былі ўсё жыццё. Не выпадкова Герцэн ужо ў XIX стагоддзі, гаворачы пра Новую Расію, Расію Бялінскага, петрашэўцаў і Чарнышэўскага, «моцна падкаваную на цяжкі шлях, загартаваную ў нястачы, горы і здзеках, цесна звязаную жыццём з народам, асветай з навукай», упамянуў, што «папярэднікам яе (Новай Расіі. — А. М.) быў плебей Ламаносаў, які быў магутны аб'ёмам і ўсебаковасцю думкі, але з'явіўся занадта рана».

Характарызуючы глыбокі і ўсеабдымны геній Ламаносава, Герцэн пісаў пра яго ў працы «Аб развіцці рэвалюцыйных ідэй у Расіі»: «Як па свайму энцыклапедызму, так і па лёгкасці ўспрыняцця гэты слаўны вучоны быў тыпам рускага чалавека. Ён пісаў па-руску, па-нямецку і па-латыні. Ён быў гарняком, хімікам, паэтам, філолагам, фізікам, астраномам і гісторыкам». Амаль у тых жа словах ацаніў Ламаносава Дабралюбаў, указваючы на разнастайнасць яго заняткаў. Ламаносаў, пісаў Дабралюбаў, «першы рускі вучоны, які адкрыў нам, што ёсць навукі, павінен быў сам зрабіцца і хімікам, і фізікам, і гісторыкам, і палітыка-эканомам, і аратарам, і ў дадатак яшчэ піітам».

Глыбокую і вобразную характарыстыку Ламаносаву даў Пушкін: «Спалучаючы надзвычайную сілу волі з надзвычайнаю сілай паняцця, Ламаносаў абняў усе галіны асветы. Прага навукі была мацнейшай страсцю гэтай душы, поўнай страсцямі. Гісторык, рытар, механік, хімік, мінералог, мастак і вершатворца, ён усё выпрабаваў і ўсё пранік... Ён стварыў першы універсітэт. Ён, лепш сказаць, сам быў першым нашым універсітэтам».

Праўда, паводле трапнай заўвагі Пляханава, «не ўсе факультэты гэтага універсітэта працавалі з аднолькавай старанасцю і з роўным поспехам». Цэнтральнае месца ў ім займалі, зразумела, цесна звязаныя адзін з адным прыродазнаўчыя факультэты: фізіка-хімічны, механіка-матэматычны, геолага-геаграфічны, горнай справы і металургіі. Аднак і гуманітарныя факультэты — філасофскі, філалагічны, палітыка-эканамічны і гістарычны — мелі калі не першаступеннае, дык усё ж немалаважнае значэнне.

Ламаносаў — заснавальнік навуковага прыродазнаўства ў Расіі. Матэрыялізм, распрацаваны ім на глебе навук аб прыродзе, уяўляе сабой салідны матэрыялістычны пачатак у гісторыі рускай філасофскай думкі.

Матэрыялістычная сістэма, створаная ў 40—60-я гады XVIII стагоддзя ў Расіі Ламаносавым, з'яўлялася арганічным працягам і завяршэннем развіцця прыродазнаўства і перадавой філасофіі ў Заходняй Еўропе XVI—XVIII стагоддзяў. Разам з тым яна дастойна ўвянчала сабою філасофскі будынак рускай думкі XVII—XVIII стагоддзяў. Глыбокі знаўца антычнай, сярэдневяковай, новай філасофіі і сучаснага яму прыродазнаўства, пачынаючы з Каперніка і Галілея, палымяны прыхільнік, паслядоўнік і прадаўжальнік старажытнага (Эпікур, Лукрэцый) і новага (Бойль, Гасэндзі, Ньютан і інш.) атамістычнага матэрыялізму, нястомны баец супраць схаластыкі, ідэалізму, грубай метафізікі, застарэлых светапоглядаў і ілжэаўтарытэтаў у навуцы, Ламаносаў, узбагачаючы і рухаючы наперад навукі аб прыродзе, ставіў і вырашаў рад карэнных тэарэтычных пытанняў прыродазнаўства, якія патрабавалі філасофскай абгрунтаванасці.

Стоячы на пазіцыях метафізічнага матэрыялізму XVII—XVIII стагоддзяў, што панаваў у прыродазнаўчых навуках таго часу, Ламаносаў, разам з тым, належаў да ліку піянераў новага напрамку, які яшчэ толькі зараджаўся ў прыродазнаўстве ў сярэдзіне XVIII стагоддзя (Эйлер, Кант, Лаплас, Вольф і інш.) і ў процівагу метафізічнаму ўяўленню аб абсалютнай нязменнасці свету пачынаў абгрунтоўваць ідэю развіцця ў навуках аб прыродзе. Дыялектычныя моманты ў філасофскіх вучэннях Бэкана, Дэкарта, Спінозы, Толанда і інш. прадоўжаны і паглыблены ў матэрыялістычнай сістэме Ламаносава.

На месца плоскага эмпірызму, недаацэнкі тэорыі, адмаўлення развіцця прыроды, тэалагічных і тэлеалагічных уяўленняў аб свеце, што пераважалі ў прыродазнаўстве і філасофіі таго часу, Ламаносаў, абапіраючыся на сваю, самастойна распрацаваную атамна-карпускулярную (малекулярную) тэорыю, а таксама на сфармуляваны ім на аснове тэарэтычнага абагульнення поспехаў прыродазнаўства закон аб захаванні рэчыва і руху (усеагульны закон прыроды), выступіў у абарону адзінства практыкі (фактаў, эксперыменту) і тэорыі (абагульнення, гіпотэз) у навуцы, імкнучыся пераадолець метафізічныя погляды на свет, выстаўляючы ідэю развіцця прыроды і адзінства прыродных законаў і выганяючы тэалогію і тэлеалогію з прыродазнаўства.

Аднак матэрыялізм Ламаносава ў галоўных рысах не выйшаў за межы гістарычна абмежаванага механістычнага метафізічнага матэрыялізму XVIII стагоддзя, падзяляючы з ім яго моцныя і слабыя бакі. Толькі XIX стагоддзе было азнаменавана трыумфам дыялектычнага погляду на развіццё прыроды. Тым не менш, многія глыбока плённыя думкі Ламаносава атрымалі ў далейшым бліскучае пацвярджэнне і абгрунтаванне. Гэта адносіцца, перш за ўсё, да ідэі яго закона аб захаванні матэрыі і руху, якая атрымала ў XIX і XX стагоддзях трывалае навуковае абгрунтаванне і універсальнае значэнне.

Ламаносаў быў не толькі вялікім вучоным-тэарэтыкам, але і практыкам. Усю сілу свайго ўсеабдымнага генія ён імкнуўся накіраваць у рэчышча садзейнічання развіццю прадукцыйных сіл нашай радзімы. Справядліва пісаў Чарнышэўскі: «Ламаносаў палымяна любіў навуку, але думаў і клапаціўся выключна пра тое, што патрэбна было для карысці яго радзімы. Ён хацеў служыць не чыстай навуцы, а толькі айчыне».

Даследаванні Ламаносава ў галінах фізікі, хіміі, электрычнасці, оптыкі, астраноміі, геалогіі, горнай справы, металургіі, геаграфіі; яго пастаянны клопат аб прамысловым развіцці Расіі, яе сельскай гаспадарцы, гандлі; стварэнне ім праекта Паўночнага марскога шляху, які ў галоўных сваіх рысах атрымаў сваё здзяйсненне толькі ў савецкі час; яго эканоміка-геаграфічныя і статыстычныя працы, накіраваныя да навуковага абгрунтавання планаў шырокага народна-гаспадарчага развіцця ўсіх абласцей Расіі, у тым ліку Поўначы і Усходу (гэтыя планы не маглі быць ажыццёўлены ва ўмовах самадзяржаўна-прыгонніцкага ладу, яны рэалізуюцца толькі ў наш час гераічнай працай савецкага народа); нарэшце, высакароднае, але, праўда, утапічнае імкненне да паляпшэння дабрабыту, здароўя і культуры расійскага народа шляхам усебаковай асветніцкай дзейнасці, якая вызваляе народ ад невуцтва і забабонаў (Ламаносаў не ставіў пытання аб рэвалюцыйным ператварэнні Расіі, спадзеючыся дамагчыся сваёй мэты на шляхах «асветнага абсалютызму»), — усе гэтыя і многія іншыя факты знаходзяць у Ламаносаве не толькі вялікага вучонага-практыка, але і вялікага патрыёта сваёй краіны.

Не забудзем таксама выдатных слоў вялікага рускага літаратурнага крытыка Бялінскага: «З Ламаносава пачынаецца наша літаратура; ён быў яе бацькам і пестуном; ён быў яе Пятром Вялікім». У другім месцы Бялінскі пісаў пра Ламаносава-літаратара: «Рускую літаратуру пачынаюць з Ламаносава, — і справядліва. Ламаносаў сапраўды быў заснавальнікам рускай літаратуры. Як геніяльны чалавек ён даў ёй форму і напрамак, якія яна надоўга ўтрымала».

А. МУРНЕЎ.

ВАЯЎНІЧЫ МАТЭРЫЯЛІСТ

У той час, калі ў навуцы панавала схаластыка і містыка, Міхаіл Васільевіч Ламаносаў імкнуўся даць строга навуковае матэрыялістычнае тлумачэнне прадметаў і з'яў прыроды.

Працы Ламаносава ў галіне прыродазнаўства з'яўляюцца і ў пяперашні час асновай навукова-матэрыялістычнага светаразумення. Ён быў глыбока перакананы, што ў аснове існуючага свету ляжыць матэрыя, якая заканамерна развіваецца.

У выніку вывучэння ўласцівасцей розных рэчываў Ламаносаў упершыню ў гісторыі чалавечай думкі ўстанавіў, што самая важная і фундаментальная ўласцівасць матэрыі — яе незнішчальнасць. Ніякі рух, на яго сцвярджэнню, не можа адбывацца без матэрыі. Так, у 1748 г. ён адкрыў усеагульны закон прыроды — закон захавання матэрыі і руху.

З гэтага часу хімія ўпершыню стала дакладнай прыродазнаўчай навукай.

Велізарнае значэнне ў барацьбе за матэрыялістычнае светаразуменне прыроды мае таксама распрацаваная Ламаносавым у 1741 — 1743 гг. атама-малекулярная тэорыя будовы рэчыва, згодна якой уся прырода, кожнае цела і рэчыва маюць атамную будову. Ім была ўстаноўлена сувязь стану цеплыні і холаду з рухам часцінак. Ён даказаў, што цеплыня ўзнікае ў выніку руху малекул. Ён падышоў да матэрыялістычнага разумення прычын хімічных уласцівасцей цел на 60 год раней, чым гэта было зроблена Дальтонам.

Навуковыя працы Ламаносава ў галіне фізікі, хіміі, геалогіі, металургіі, мараплавання, мінералогіі былі звязаны з патрэбамі народнай гаспадаркі Расіі. З Ламаносава пачынаецца развіццё металургічнай, горнадабываючай, фарфоравай, шкляной, солезлабмываючай прамысловасці.

Ламаносаў быў непахісным у адстойванні матэрыялістычных поглядаў, ваяўнічым атэістам. Яму належыць вялікая заслуга ў падрыве агульных ідэалагічных асноў рэлігіі. Ён не толькі сам не прызнаваў існавання бога і іншых звышнатуральных сіл, але і актыўна змагаўся супраць рэлігійнага светаразумення. Ён смела адмаўляў антынавуковы погляд аб нязменнасці прыроды з часу так званага стварэння яе богам. «Дарма многія думаюць, што ўсё, як бачым, спачатку тварцом створана... быццам не толькі горы, долы і воды, але і розныя мінералы ўтварыліся з усім светам і таму непатрэбна даследаваць прычыны. Такія меркаванні шкодныя прырашчэнню ўсіх навук, а, значыцца, натуральным ведам зямнога шара... хаця гэтым разумнікам і лёгка быць філосафамі, вывучыўшы напамяць тры словы: бог так стварыў, і гэтым даючы адказ на ўсё».

Рэзка выступаючы супраць рэлігійных абрадаў, ён пісаў: «Упартых папоў, якія хочуць гвалтоўна хрысціць халоднай вадой, лічу я катамі, таму што жадаюць пасля радзін і хрысцін хутка і пахавання для сваёй карысці».

Г. ГАЦКО.

МАЯК РУСКАЙ ФІЛАЛОГІІ

«Одамі, публічнымі прамовамі і дысертацыямі скарыстоўваў і ўпрыгожваў я Акадэмію перад усім светам дваццаць гадоў. На прыроднай мове рознага роду маімі творамі граматычнымі, рытарычнымі, вершаванымі, гістарычнымі, таксама і да высокіх навук належачымі, фізічнымі, хімічнымі, механічнымі, стыль расійскі ў мінулыя дваццаць год несумненна вычысціўся перад ранейшым і многа здольней стаў для выказвання ідэй трудных, пра што сведчыць агульная апрабацыя маіх твораў і ва ўсякіх пісьмах ужываемыя з іх словы і выразы, што для асветы народа многа служыць»,—так пісаў Міхайла Ламаносаў у запісцы на імя імператара ў ліпені 1762 г.

Для такой ацэнкі сваёй дзейнасці вялікі вучоны меў усе падставы.

Да Ламаносава пытаннямі рускай мовы амаль ніхто сур'ёзна не займаўся, хоць у гэтым была вялікая неабходнасць, пастаўленая самім жыццём. У пятроўскую эпоху ў рускай мове адбыліся вялікія змены. З аднаго боку, царкоўнаславянская моўная стыхія пачала саступаць месца жывой гутарковай мове рускага народа; з другога — узмацніўся прыток замежных моўных элементаў. Вялікі вучоны і паставіў перад сабой задачу адстаяць нацыянальную самабытнасць роднай мовы. З уласцівай яму празорлівасцю Ламаносаў вызначыў шлях развіцця рускай літаратурнай мовы, які ідзе праз творчасць А. Пушкіна да М. Горкага, да сучаснай літаратуры.

Асноўныя палажэнні М. Ламаносава аб шляхах развіцця рускай літаратурнай мовы і яе граматычных законах выказаны ім у «Расійскай граматыцы» і артыкуле «Аб карысці кніг царкоўных у расійскай мове».

Ламаносаў-філолаг шырока выкарыстоўваў у сваіх працах рускую народную паэзію. Ён вельмі часта звяртаецца да рускіх народных прыказак і прымавак.

У мастацкіх творах Ламаносава знаходзім творчае выкарыстанне ім народнага моўнага багацця. Яго сатырычныя творы цесна звязаны з народнай сатырай, перш за ўсё з сатырай рускіх народных прыказак і прымавак. Ламаносаў першы абгрунтаваў тэарэтычныя асновы развіцця нацыянальнай літаратуры на багатай глебе рускай народнай творчасці.

Нельга не бачыць, што напрамак і змест паэтычнай спадчыны Ламаносава абумоўлены самім часам. Творы яго носяць пераважна палемічны характар, бо яго час патрабаваў ад рускіх пісьменнікаў упартай барацьбы за нацыянальную культуру, а значыць і за народ і радзіму.

Ламаносаў — не толькі вялікі паэт, але і выдатны крытык і тэарэтык літаратуры. Многія яго палажэнні як бы накіраваны ў нашу сучаснасць, да нашых пісьменнікаў. У сваім разважанні «Аб якасцях вершаскладальніка» Ламаносаў гаворыць, што паэт павінен валодаць вялікім запасам ведаў, бо думка паэта «нараджаецца як ад глыбокай эрудыцыі, так і ад далучанага да яе высокага духу і агню прыроджанай вершатворчасці».

Выступаючы супраць рамесніцтва ў паэзіі, Ламаносаў гаворыць і аб цяжкай складанай працы пісьменніка. «Многіх навук дасканаласць мае свае межы, але вершатворчасць мець іх не можа. Каб быць дасканалым паэтам, патрэбна аб усіх навуках мець дастатковае паняцце, а ў многіх — дасканалыя веды...»

Надзвычай вялікія заслугі Ламаносава і ў распрацоўцы тэорыі рускага вершаскладання. Гэтаму пытанню прысвечана яго першая тэарэтыка-літаратурная праца «Пісьмо аб правілах расійскага вершаскладання» (1739).

Можна пісаць прыгожа толькі тады, сцвярджае Ламаносаў, калі паэт добра ведае мову і засвоіў граматычныя правілы. «Тупая араторыя, каснаязычная паэзія, негрунтоўная філасофія, непрыемная гісторыя, няпэўная юрыспрудэнцыя без граматыкі», — пісаў ён.

Вучоны і паэт Міхаіл Васільевіч Ламаносаў увасобіў у сабе рускі народны геній. Бялінскі гаварыў, што гэта такі геній, які «ўмее перамагаць усе перашкоды, якія ні стаўляў бы яму варожы лёс, што, нарэшце, рускі здольны да ўсяго вялікага і цудоўнага».

Ул. БОГАН.

У беларускім друку

У 1911 г., да 200-годдзя з дня нараджэння М. В. Ламаносава, М. Багдановіч напісаў артыкул «Паэзія геніяльнага вучонага». Да нас дайшоў няпоўны тэкст гэтага артыкула, які быў надрукаваны ўпершыню ў другім томе Збору твораў паэта за 1928 г.

М. Багдановіч гаворыць пра Ламаносава: «Гэта была душа геніяльнага вучонага, вялікага правідцы прыроды. Энцыклапедыст па сваіх пазнаннях, ён валодаў інстынктам Калумба, ён пастаянна імкнуўся да новых адкрыццяў і дасягненняў. Шырыня ведаў і яшчэ большая шырыня ўяўлення дазвалялі яму маляваць грандыёзныя карціны космасу, стварацъ смелыя гіпотэзы, якім было месца калі не ў навуцы, дык у паэзіі».

У савецкі час беларускія вучоныя напісалі шэраг прац аб Ламаносаве. Большасць з іх прысвечана разгляду яго навуковай дзейнасці.

У часопісе «Полымя» (№ 11, 1951) быў змешчаны артыкул І. Палосіна «Міхаіл Васільевіч Ламаносаў», у якім пададзена біяграфія вялікага вучонага і ахарактарызавана яго дзейнасць як вучонага і пісьменніка.

Вялікае даследаванне Е. Азаранкі «Светапогляд М. В. Ламаносава» выдаў у 1959 г. Белдзяржуніверсітэт. Е. Азаранка апублікаваў таксама асобныя артыкулы пра вялікага вучонага.

Светапогляду Ламаносава прысвечаны артыкул В. Сцяпанава «Аб тэндэнцыі М. В. Ламаносава да выхаду з рамак метафізічнага светапогляду» (1959).

У 1952 г. Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў БССР выдала папулярную брашуру М. Ярмоленкі «М. В Ламаносаў — заснавальнік хіміі».

Цікавыя работы аб навуковай дзейнасці Ламаносава напісаны акадэмікам М. Безбародавым, найбольш грунтоўная з якіх — манаграфія «М. В. Ламаносаў і яго работы па хіміі сілікатаў».

Многа артыкулаў, прысвечаных Ламаносаву, друкавалі газеты рэспублікі.

Н. САЎЧАНКА.

Ля вытокаў

М. В. Ламаносаў быў геніяльным вучоным не толькі ў розных галінах прыродазнаўчых навук, але і вялікім вучоным-філолагам, выдатнейшым паэтам сярэдзіны XVIII ст. Ён вывеў далёка наперад айчынную і сусветную навуку, рускую культуру і літаратуру, а таксама аказаў вялікае ўздзеянне на літаратуру ўкраінскага і беларускага народаў.

У 1739 г. Ламаносаў выступіў са славутым «Пісьмом аб правілах расійскага вершаскладання», якое з'явілася вяхой і паваротным пунктам у развіцці не толькі рускай, але і ўкраінскай, а затым і беларускай паэзіі. Крыху пазней у сваёй «Рыторыцы» (1748) і далей у трактаце «Аб карысці кніг царкоўных у расійскай мове» (1757) ён распрацаваў важнейшыя пытанні літаратурнай мовы і стылю, што аказала выключна вялікі і дабратворны ўплыў на развіццё літаратуры ўсходніх славян.

Ламаносаў першы з усходнеславянскіх філолагаў і паэтаў рашуча адкінуў старажытную сілабічную (роўнаскладовую) сістэму вершапісання, як неўласцівую мове яго сучаснікаў. Гэтым ён завяршыў вершатворную рэформу, якую практычна распачаў яшчэ Пракаповіч (ва ўкраінскі перыяд яго дзейнасці) і развіў далей не толькі ў практычных, але і ў тэарэтычных адносінах (хоць яшчэ далёка не закончыў) Традзіякоўскі.

Ламаносаў першы заявіў, што «расійскія вершы належыць складаць па прыроднай нашай мовы ўласцівасці». Трэба зазначыць, што пад «расійскай мовай» ён разумеў усе яе «дыялекты» — г. зн. усе ўсходнеславянскія мовы. Значыць, сілабічную сістэму вершаскладання ён справядліва лічыў непрыгоднай для ўсёй усходнеславянскай паэзіі, што практычна адчувалі і рускія, і ўкраінскія, і беларускія паэты XVII — пачатку XVIII стагоддзяў. Невыпадкова аўтары «віршаў», напрыклад, Сімеон Полацкі, яшчэ ў XVII ст. у радзе выпадкаў адступалі ад правілаў сілабікі.

Мовам і паэзіі ўсходніх славян уласціва не сілабіка, а тоніка. Невыпадкова ў народна-паэтычнай творчасці нашых народаў пераважае танічны прынцып, на які яшчэ нясмела арыентаваўся Пракаповіч і ўжо свядома Традзіякоўскі, а за ім і Ламаносаў.

Канчатковае вызваленне паэзіі ад старой схаластыкі было падказана Ламаносаву практычнымі патрэбамі, у прыватнасці — імкненнем апець героіку «русской ужасной силы» ў барацьбе з іншаземнымі захопнікамі, вынікам чаго з'явілася яго першая ода — «Ода на перамогу над туркамі і татарамі і на ўзяцце Хоціна 1739 года».

Паэтычная практыка Ламаносава трывала замацавала гэтую рэформу. Акрамя таго, вялікі паэт канчаткова ўсталяваў у новай рускай літаратуры грамадска важную тэматыку, даў узоры высокаідэйнай паэзіі, якая вызначаецца яркай вобразнасцю і паэтычным натхненнем. Невыпадкова за Ламаносавым пайшлі ўсе перадавыя рускія паэты-сучаснікі, у тым ліку Традзіякоўскі і паэты пазнейшага часу.

За Ламаносавым пайшлі не толькі рускія, але і ўкраінскія і беларускія паэты. Ужо ў сярэдзіне XVIII ст. ён меў сваіх прыхільнікаў сярод украінскіх і беларускіх чытачоў. Характэрна, што паэтычная творчасць Ламаносава карысталася поспехам перш за ўсё сярод моладзі, у прыватнасці сярод студэнтаў Кіеўскай акадэміі (у ліку якіх было нямала і беларусаў). Пацвярджэннем сказанага з'яўляюцца многія рукапісныя зборнікі. Адзін з такіх зборнікаў, складзены невядомым студэнтам Кіеўскай акадэміі, уключае дваццаць год і дзевятнаццаць надпісаў Ламаносава.

З украінскіх культурных дзеячоў адным з першых паследаваў за Ламаносавым Рыгор Сковарада. У 1753 г. ён падрыхтаваў для студэнтаў Пераяслаўскай калегіі, у якой у той час працаваў выкладчыкам, арыгінальны курс паэтыкі «Разважанне аб паэзіі і кіраўніцтва да майстэрства яе», заснаваны на трактатах Традзіякоўскага і асабліва Ламаносава.

Усё ж новая сістэма вершапісання неўзабаве перамагла і на Украіне. Спачатку яна атрымала перамогу ў паэтычнай практыцы ўкраінскага прыхільніка Ламаносава — паэта Ігнаця Максімовіча (выхаванец, а затым выкладчык Кіеўскай акадэміі).

Такім чынам, сілаба-танічны прынцып вершапісання, канчаткова ўсталяваны Ламаносавым у рускай літаратуры ў сярэдзіне XVIII ст., неўзабаве пранік і на Украіну, ва ўкраінскую паэзію, а крыху пазней (часткова праз украінскую літаратуру) і ў беларускую літаратуру. Гэта паскорыла працэс вызвалення ўкраінскай і беларускай літаратур ад старых схаластычных традыцый, у іх узмацніліся элементы рэалізму і народнасці, падрыхтоўваліся ўмовы пераходу старажытных украінскай і беларускай літаратур у новую якасць — у новыя літаратуры.

П. АХРЫМЕНКА.

Маскоўскі дзяржаўны універсітэт на Ленінскіх гарах.
НА ЗДЫМКУ: помнік М. В. Ламаносаву.
Фота **Н. ГРАНОЎСКАГА.** (ТАСС).

Міхайла Ламаносаў

Аляксей МАРКАЎ

Урывак з паэмы

Ляжыць у вышытай кашулі...
З акна вачэй не адарвеш.
Пупышкі красавік адчулі,
Вядзе секундам лік капеж.
Заплюшчыць вочы — хваля мерна
Гайдае, падымае ў лёт.
Дрымотай лезе неймавернай,
Гудзе, як вулей, калаўрот.
Адкінуў хворы прасцірадла
І халадок крануў чало.
І праз хвіліну зноў няшчадна
У дрыжыкі ўсяго ўзяло...
І зноўку пульса перабоі,
І гасне зрок ад цемнаты.
Я знаю, сэрца, што з табою,
Я знаю, стомленае ты.
Як птах падбіты, прагне ўзвіцца
Ды цяжка ўзняць яму крыло.
І як яшчэ ты можаш біцца,
Ды ты ж даўно згарэць магло!
Ідуць, плятуцца год за годам.
Чаго ты толькі тут не знёс
У славу рускага народа
І за яго вялікі лёс!
Ля Васкрасенскай брамы хвацка
У літаўры білі ў гэты час:
Такое свята вам не цацка,
У Маскве такое — першы раз.
Вось адкрыццё ўніверсітэта
У святочнай збудзецца Маскве...
Шпакі нібы адчулі гэта —
Ім сінь і высь у галаве.
Вучоныя ў адзенні строгім,
І шкаляры са Спаскіх школ,
І госці, толькі што з дарогі,
І шмат хто з далечы прыйшоў.
У світах носкіх тут сяляне,
Праездам, што былі ў Маскве,
Сваё давалі меркаванне,
Прылёгшы гуртам на траве.
Усе: купец, жабрак хірлявы —
Не прапусцілі гэтых свят,
Ад дзёгцю льсніліся халявы,
Бліснуць быў глянцам кожны рад.
З фасадаў сцен на ўсіх паказна
Шувалаў зверху паглядаў
І поспехаў жадаў выразна,
Сам стомлены ад важных спраў.
Нібы ён рускі храм навукі
Абдумаў вунь з якой пары,
І слаўце ўсе — малы, стары
Яго натруджаныя рукі.
І гордая стаяла тут
Сям'я вучоных Пецярбурга:
Цяплоў — залочаны сурдут,
Шумахер з Таубертам шустрым.
Ды толькі не было таго,
Хто марыў з першых сваіх
крокаў
Не пра карысць мяшка свайго,
Не аб пасадзе звышвысокай...
Ён марыў, што ў яго народзе
Патухне рабалепства страх,
І моц, якое не знаходзім,
У мудрых знойдзем букварах,
І будзе ззяць святло Расіі
Праз край вялікае зямлі!
І вось яго не запрасілі
На урачыстасць.
Што ж, калі
Забыліся, хай дзеля жэста
Высокі б запрасіў савет
Яго, што вызначыў тут месца,
Дзе стане універсітэт,
Якія ў вокнах будуць рамы,
Дзе кветнікам наўкол ірдзець,
Якія планы і праграмы
І факультэт які ідзе...
Яго, хто пазбіваў парогі,
Прасіў Шувалава ён для...
Ледзь ён не кланяўся у ногі:
Моў, просіць руская зямля.
Закіньце слова у царыцы, —
Навука — лепшага быццё,
Магу, мо трэба, памаліцца
За ваша і яе жыццё.
...Забыліся, не запрасілі,
І, можа, сэрца ад таго
Спыняецца, губляе сілу...
А папракаць, вініць каго?
— Папоўскі, кажаш, хоча нейкі?
Ах, Лізачка, з усіх жа ног!..
Ды з форткі скінь усе заклейкі,
Не прастужуся я, дальбог!
Прысядзь, Міколенка, то ж
дзякуй,
Што ты старога не забыў...
Ты хмуры нешта? Нібы плакаў?
Мо глупства? Ах, я не сляпы...
А, разумею... Што ж ты гэта?..
Часы такія прыплывуць —
Не толькі універсітэтам
Імёны нашы нададуць.
І на Русі, дзе сэрца промень,
Дзе ўкладзен жар маёй душы,
Усё, усё тады прыпомняць,
Як нашу славу ні душы.
Заўжды за намі застанецца,
Ліхім зычліўцам як на зло,
Што у вяках цяпер пяецца,
Што ззяе ў будучым святлом.
Ну, не складай, Міколка, рукі
І сей дабро, каб быў усход.
З добразычлівым словам ўнукі
Сажнуць наш плён у нейкі год.
Таму я толькі заклапочан,
Што раптам працы маёй плён
Дурнымі будзе пазалочан,
«Святыняй» раптам стане ён.
Хвальбу бязмерна будуць
множыць,
Нязгодных выпхнуць яны ў бок,
Асобным спісачкам прыложаць,
Або не пусцяць і на крок.
Хачу я, дарагія людзі,
У спрэчках з вамі быць заўжды!
Няхай мяне ўжо і не будзе, —
Спрачайцеся вы і тады.

* * *

Зіхіціць у сценах мармур светлы.
Стралою ў неба бліснуў дах.
Цудоўны, казачны і ветлы
На горах Ленінскіх той гмах.
Узвышшы воддаль, як падкова,
Што абвівае стан Маскве.
Красой цудоўнаю, суровай
Уверх ён зоркаю імкне.
Сюды прыйшлі якут і немец,
І для француза шлях адкрыт,
Рыбак-кітаец ў захапленні —
Янцзы, моў, з Волгаю сябры.
Як ўсенароднай дружбы злітак
Тут ззяе універсітэт,
У даль, што змрочнасцю пакрыта,
Праменні міру, праўды шле.
А ноччу смех і феерверкі,
Сукенкі кветкамі мігцяць,
Нядаўнія шчэ піянеркі
Цяпер саромліва глядзяць.
Ідуць студэнткі...
Як вяселле,
Усё ад радасці гарыць...
Ды сёння ж свята — наваселле,
Гасціна з ранняе пары.
Тут адкрыццё ўніверсітэта, —
І трубы медныя пяюць
Пра час былы, пра тыя леты,
Нібы вось голас падаюць.
І не запрошаны, далёкі
Прыйшоў і стаў жывы, як быў,
Наш родны, шчыры і глыбокі...
Над ім хмурынак гурт праплыў.
Стаіць на плошчы, на відне,
Як злепак долі ён народу,
Што ў шчасці стрыман,
моцны ў горы,
Не зачапі —
ён не кране!

Пераклад з рускай мовы

С. ШУШКЕВІЧА.

ЗАЎСЁДЫ З МАЛАДЫМ СЭРЦАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

Мастак, старанна адбіраючы выяўленчыя сродкі, стварае запамінальныя пейзажы, яркія і паэтычныя вобразы. Праўда, іншы раз і ў неблагіх творах знаходзім надакучлівыя штампы: «сталёвыя коні», «песня хваляй разліецца», «як акіян, шуміць пшаніца», «ходзяць хвалі, як на моры, праз жытнёвыя прасторы». Досыць многа трапляецца нязграбных сказаў і параўнанняў, нічым не апраўданых пераскокаў думкі: «На ворага хадзіў у бітвы, хоць вораг быў аж вельмі люты», «Стала полымя з іскры, зазіхцела над намі», «У нас машын усяких поўна, не мала ёсць і параходаў», «Тут вырашаўся лёс майго народа і тут ён біўся з дзікаю ардой...», «Гараць прыветныя агні і над ракой, і ў вышыні...», «Як пачэсны за працу вянок на чало атрымала настаўніцкі сціплы дыплом...» і г. д. Паэтычна неадшліфаваныя як след, недакладна выказаныя думкі шкодзяць многім вершам зборніка, зніжаюць іх ідэйна-мастацкую вартасць і не прыносяць чытачу патрэбнай эстэтычнай асалоды («На замчышчы ў Тураве», «Не востры меч і не гарматы», «Люблю вясну» і іншыя).

Значнае месца ў новай кнізе Уладзіміра Дубоўкі займаюць казкі. Мудрыя ў сваёй народнай аснове, поўныя яркіх і прыгожых пачуццяў, яны пакідаюць прыемнае ўражанне. Добра ведаючы фальклор, нацыянальныя звычаі і побыт свайго народа, пісьменнік у кожным канкрэтным выпадку з тонкім мастацкім густам «увязвае» чыста казачныя элементы з надзвычай тыповымі і каларытнымі праявамі характару і нораваў простага чалавека, ад прыроды разумнага і энергічнага, разважлівага і сардэчнага. Менавіта ён, звычайны і шчыры працаўнік, які пры любых абставінах не забываецца на сваю высокую годнасць і становіцца галоўным героем гэтых твораў («Хто дужэйшы?», «Вяльможны пых»). Аўтар цёпла і пранікнёна паказвае, як вялікая мудрасць і светлы розум прыгоннага селяніна не раз ратавалі яго ад бяды і злога наслання, памагалі яму ўзяць верх над праціўнікам. Станоўчым героем казак уласцівы самыя чыстыя намеры, шырокі душэўны размах; іх учынкі, прасякнутыя жыццесцвярджальным аптымізмам, няхітрым філасофскім роздумам і лёгкаю непрытоенай усмешкаю, выклікаюць у нас шчырае пачуццё спагады і захаплення («Матчына парада» і інш.).

Своеасаблівай апрацоўкай вядомага падання пра Цмока-ліхадзея адкрываецца і паэма Уладзіміра Дубоўкі «Беларуская Арыядна» — твор аб гераічнай барацьбе беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У цэнтры паэмы вобраз маладой партызанкі-разведчыцы Арыядны Казей, якая, не шкадуючы ні здароўя, ні жыцця, змагалася з ненавіснымі акупантамі, а пасля вайны ўсе свае духоўныя сілы скіравала на выхаванне падрастаючага пакалення. Як бачым, цікавая, удзячная задума. Аднак, на наш погляд, па-сапраўднаму мастацкага, хвалюючага твора не атрымалася. Паэт надзвычай сціслы, канспектыўна, у паасобных мясцінах нічым не апраўданай скорагаворкай апавядае пра цяжкі шлях выпрабаванняў патрыёткі. Вешкі на яе невялікай яшчэ, але змястоўнай жыццёвай дарозе расстаўлены настолькі выпадкова, што чытачу не толькі не ўдаецца прасачыць за эвалюцыяй гераіні, а і наогул уявіць, хоць бы з большага, яе аблічча, яе характар, яе думы і перажыванні. Пісьменнік ад пачатку да канца аперыруе гатовымі паэтычнымі катэгорыямі і нідзе не робіць спробы даць пэўны мастацкі фон, на якім жывымі фарбамі зайграў бы вобраз мужнай дзяўчыны. Варта прывесці цалкам восьмы раздзел паэмы, дзе аўтар замест сапраўды мастацкага паказу гераізму адважнай сувязной прапануе серыю халодных выкладак:

Арыядна адна засталася зусім
Цераз ноч яна йдзе з
даручэннем сваім
Памарожаны ногі,
На ранах ідзе,
каб ратунак таварышам даць
у бядзе.
Цераз цёмную ноч яна йдзе,
праз лясы.
На дарозе чутны чужаніц галасы
Так праходзіць яна за вярстою
вярсту.
Сустракае яна партызан
на пасту.
Па трывозе — на конях
выходзіць атрад
Праз гадзіну памога імчыцца
назад:
зратавалі, забралі з аблогі
сяброў..
Арыядна ў дарогу збіраецца
зноў.

Хіба могуць такая шэрая мова і бясстрасны тон перадаць душэўны стан чалавека, які хвіліну назад страціў у сутычцы з ворагам двух сяброў і цяпер адзін, сярод ночы, з абмарожанымі нагамі спяшаецца выклікаць на дапамогу партызан суседняга атрада? Недаведнасць выяўленчых сродкаў тэме парушыла ідэйна-мастацкую гармонію ў творы. Не дзіўна, што чытаеш яго без унутранага хвалявання і цікавасці.

У новую кнігу аўтар уключыў каля шасцідзесяці сваіх твораў і некалькі перакладаў. Добры здабытак! Але, калі перагортваеш апошнюю старонку, міжвольна хочацца адзначыць: не, не ўсе свае магчымасці выкарыстаў таленавіты пісьменнік, не ўсё зрабіў, што мог бы зрабіць. Шмат знаходзім слядоў спешкі. Трапляюцца рэчы, якія пры большай аўтарскай патрабавальнасці не павінны былі трапіць у друк. І ўсё ж радуе творчая актыўнасць паэта, яго нястомныя пошукі новых і цікавых тэм, новых герояў, новых форм мастацкага адлюстравання нашай рэчаіснасці. А настойлівыя пошукі, як вядома, заўсёды прыносяць плён.

Л. САЛАВЕЙ.

Куба, 1961

Калі праглядаеш гэты фотарэпартаж спецыяльнага карэспандэнта «Правды» Ул. Валодкіна, перад вачыма праходзіць цудоўны працэс будаўніцтва новага жыцця свабоднай гераічнай Кубы.

Твар правадыра Кубінскай рэвалюцыі Фідэля Кастра — гэта аблічча сённяшняй Кубы. Суровы і гнеўны, як цяпер, ён можа быць спакойны і ласкавы. Яго вочы могуць усміхацца, як вочы дзяцей.

Па вуліцах Гаваны ідзе атрад народнай міліцыі. Кубінскія жанчыны ў блакітных кашулях са зброяй на плячах. «Вораг не пройдзе!»

Ваенную форму апранулі розныя людзі, розныя па ўзросту, прафесіі і колеру скуры. Яны ва ўсім падтрымліваюць свой рэвалюцыйны ўрад. І ў знак адабрэння патрыёты ўздымаюць сялянскія мачэтэ, прылады мірнай працы, або аўтамат, які радзіма дала ім у рукі для барацьбы з ворагам.

Гэтыя маладыя кубінкі ўважліва праглядаюць часопіс «Савецкі Саюз». Яны ўсміхаюцца. Магчыма, кожная з іх уяўляе ў гэтую хвіліну, што недалёкі той час, калі і на Кубе будзе такое ж шчаслівае жыццё.

НА ШЫРОКУЮ ДАРОГУ

На блакітных экранах мінскіх тэлевізараў за апошні час усё часцей пачалі з'яўляцца тэлевізійныя кароткаметражныя фільмы.

Праўда, некаторыя з гэтых твораў яшчэ слабыя: у іх невыразны сюжэт, зацягнуты мантаж. Аднак гэта — часовая «хвароба» творчага росту, і яна паступова ліквідуецца.

Бадай самым характэрным пацвярджэннем гэтага з'яўляецца новы тэлевізійны кароткаметражны фільм «Жыццё, аддадзенае людзям» (рэжысёр С. Фрыд, аўтар сцэнарнага плана і тэксту Р. Ясінскі). Гэта першая сур'ёзная спроба нашых тэледакументалістаў узняць і асвятліць вялікі гістарычны матэрыял. Фільм расказвае пра гераічны жыццёвы шлях слаўнай дачкі беларускага народа Веры Захараўны Харужай, якую Н. К. Крупская назвала «чалавекам моцнай волі, перакананым рэвалюцыянерам, барацьбітом за рабочую справу».

Тэма складаная. Старых здымкаў і дакументаў аб В. Харужай захавалася мала. І ўсё ж работа па збору іх прынесла поспех. Фільм глядзіцца з цікавасцю.

Вера Харужая выйшла з глыбінь беларускага народа. Нарадзілася яна ў Бабруйску, юнацкія гады правяла ў Мазыры. У цяжкі час нямецкай і белапольскай акупацыі мацнеюць і развіваюцца яе палітычныя погляды бальшавіка. Асаблівую ўвагу надаюць аўтары фільма перыяду барацьбы супраць акупацыі Заходняй Беларусі белапалякамі. У гэтыя гады В. Харужая прымае актыўны ўдзел у стварэнні камсамола ў Заходняй Беларусі. Ва ўмовах жорсткіх рэпрэсій яна стварае дзесяткі камсамольскіх ячэек на Палессі, на Слонімшчыне і Навагрудчыне. Пры яе ўдзеле выдаецца газета «Малады камуніст». У гэтыя гады В. Харужая — член ЦК КПЗБ. Ніякія нягоды, ніякія пагрозы і катаванні дэфензівы не маглі зламаць волю В. Харужай і яе веру ў справядлівасць рэвалюцыйнай справы.

У фільме прыводзіцца запіс у пратаколе Брэсцкага акруговага суда аб выступленні Харужай і яе паводзінах на працэсе 133 членаў КПЗБ і КСМЗБ у 1928 годзе. В. Харужая «з гонарам гаворыць, што належыць да Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, якая з'яўляецца не групаю змоўшчыкаў, а партыяй пралетарыяту... У рэдах КПЗБ працавала свядома і будзе працаваць у далейшым, калі выйдзе з турмы. Камуністычнай ідэі адданая і ёй верна служыць».

Падрабязна асветлены ў фільме і наступныя этапы жыцця гераічнай дачкі беларускага народа.

Гэтаму падпарадкавана ўся драматургія фільма. Яна пабудавана на цесным перапляценні дакументаў мінулага і цяперашняга. Хроніка рэвалюцыйнай барацьбы на тэрыторыі Заходняй Беларусі 20-х гадоў чаргуецца з расказамі блізкіх і сваякоў В. Харужай — брата В. Харужага і яе першай настаўніцы В. Трызна.

Цікава вырашане ў кінанарысе паказ архіўных матэрыялаў, у прыватнасці фатаграфій В. Харужай перыяду зняволення яе ў казематах дэфензіўы. На ўвесь экран — твар В. Харужай. Упартая ўсмешка ў куточках вуснаў гаворыць аб непахісным характары рэвалюцыянеркі. І раптам чуваць, як рыпяць заржавелыя дзверы турэмнай камеры, чорны цень кратаў кладзецца на твар гераіні.

З густам напісаны Р. Ясінскім дыктарскі тэкст да нарыса. Ён адпавядае задуме рэжысёра, узмацняе і канкрэтызуе яе. Сапраўдным пафасам гучаць на фоне турэмных прыступкаў, па якіх вадзілі на допыт В. Харужую, словы: «Тут голадам, катаваннямі і нягодамі спрабавалі задушыць волю кожнага, хто паўставаў супраць прыгнёту і гвалту. Але нішто не магло запалохаць мужную, зламаць непахісную пахісную перакананую!» Гэтыя словы сталі лейтматывам фільма

Аднак «няма ружаў без калючак», і пра іх варта сказаць. Не вельмі добрае ўражанне пакідае аператарская работа: не зусім удала зняты кадры, далучаныя да сабранай кінахронікі і архіўных фотаздымкаў. Яны розныя па колеру, не прадуманы кампазіцыйна і не выразныя па рухах (напрыклад, школьны збор), за выключэннем хіба толькі панарамных здымкаў лесу і балот у эпізодзе пераходу В. Харужай лініі фронту.

Новы фільм мінскіх тэледакументалістаў яшчэ раз паказвае, што ім пад сілу складаныя творчыя задачы.

І. ВЕСНІК.

Вечар фартэпіяннай музыкі

Беларуская кансерваторыя праводзіць серыю змястоўных канцэртаў з твораў савецкіх кампазітараў. Адзін з іх адбыўся ў зале кансерваторыі 14 лістапада. Гэта быў вечар фартэпіяннай музыкі. Арганізатары яго паішлі далей задач чыста акадэмічнага характару. У канцэрце прымалі ўдзел толькі студэнты-піяністы класа прафесара М. Бергера.

Але асаблівая складанасць гэтага фартэпіяннага вечара заключалася ў не традыцыйнай, не «заштампаванай» музычнай праграме: на ім гучалі толькі беларускія творы. Прафесар М. Бергер праявіў пэўную творчую смеласць, паставіўшы перад сваімі выхаванцамі задачу цікавых мастацкіх пошукаў.

У канцэрце выконваліся фартэпіянныя творы М. Аладава, А. Багатырова П. Падкавырава, Ул. Алоўнікава, Д. Камінскага.

Бліскучая канцэртная транскрыпцыя ў традыцыйным лістаўскім плане — «Полька» Сметаны — Камінскага патрабавала ад выканаўцы — студэнта V курса Л. Юшкевіча — пэўнай тэхнічнай сталасці, гукавой маштабнасці. Л. Юшкевіч свабодна валодае цяжкай, раскіданай фактурай п'есы, адчувае яе стыль, умела падпарадкоўвае мноства віртуозных дэталей прывабнай тэме польскі Сметаны. А ў санаціне М. Аладава малады піяніст тонка перадае светлы гумар беларускай «Бульбы» і пераканальна падкрэслівае цікава задуманае кампазітарам вобразнае пераўвасабленне грацыёзнага танца ў магутную і патэтычную тэму душэўнага болю. Л. Юшкевіч — сур'ёзны і шматабяцаючы музыкант.

Складаныя творчыя задачы ставіць перад выканаўцамі маштабная саната А. Багатырова. Яна прасякнута высокай рамантыкай, якая ўваскрашае традыцыі высакароднай летуценнасці Глазунова, суровай філасофіі, сціплай і чыстай лірыкі Танеева. Апроч вялікай эмацыянальнасці, саната патрабуе ад піяніста ўмення ахапіць буйную форму, выявіць у ёй элементы скразнога музычнага развіцця. Трактоўка гэтай санаты студэнтам IV курса В. Крыштопенкам была дастаткова пераканальная. Ён уважліва слухае сябе і імкнецца да тэмбравай разнастайнасці ў складаній паліфанічнай тканіне першай часткі санаты, да далікатных тэмбравых штрыхоў у другой частцы, да аркестравых гучнасцей у фінале. Магчымы і іншыя трактоўкі, але тое, што робіць В. Крыштопенка, зусім заканамерны выканаўчы варыянт.

Удумлівай піяністкай зарэкамендавала сябе студэнтка Л. Тэр-Мінасян (V курс), якая выконвала санаціну Э. Тырманд. Гэта твор, у якім сучасны піянізм выяўляецца мноствам складаных рытмаў, акордавых трэлей і г. д. Юнацкая свежасць зместу, пракоф'еўская жартаўлівасць, напорыстасць у гэтым творы вельмі блізкія да выканаўчай манеры студэнткі-выпускніцы. У яе добрая тэхніка, і студэнтка знайшла правільную агульную афарбоўку санаты: востры гук, дакладны тэмп, што садзейнічала поспеху выступлення Тэр-Мінасян.

Зусім іншае выканаўчае аблічча ў студэнткі другога курса А. Хімчанка. Яе бясспрэчная вартасць — вялікая цеплыня «спяваючага» гуку. І ў лірычнай імправізацыйнай прэлюдыі А. Багатырова, і ў песеннай паэме П. Падкавырава гэтая якасць піяністкі праяўляецца даволі поўна і цікава. Арыгінальная па сваіх нацыянальных асаблівасцях і даволі складаная стылістычна паэма П. Падкавырава. У аснову гэтага праграмнага твора, навеянага вершамі Янкі Купалы, аўтар паклаў задушэўную лірычную тэму. П. Падкавыраў выкарыстоўвае разнастайную варыяцыйнасць: і народны арнамент, і матыўнае развіццё, і вобразнае пераўвасабленне. Вобразы эпічна-велічныя існуюць тут побач з лірыкай, суровым драматызмам, імправізацыйнасцю. З-за такой вобразнай стракатасці ўзнікае асаблівая цяжкасць для выканаўцы. Трэба спадзявацца, што А. Хімчанка будзе працаваць далей над паэмай, удакладняць і яшчэ больш удасканальваць яе трактоўку.

Менш пераканальным было выкананне некаторых фартэпіянных мініяцюр у канцэрце. Арганізавана і пісьменна іграла студэнтка IV курса Н. Жылкамлінава, але ўжо занадта па-вучнёўску. Ёй яўна не хапае свабоды, гукавой тонкасці і разнастайнасці. Нядрэнна выступіла з п'есамі П. Падкавырава і Ул. Алоўнікава студэнтка другога курса С. Оськіна.

Канцэрт быў змястоўны, яму папярэднічала цікавае ўступнае слова музыказнаўцы К. Сцепанцэвіч. На жаль, фартэпіянны вечар быў дрэнна афішыраваны, і на ім прысутнічала мала слухачоў. Нам здаецца, што варта было б наладзіць канцэрты беларускай фартэпіяннай музыкі перад шырокімі масамі слухачоў — рабочымі, студэнцкай моладдзю Мінска.

Сёння адбудзецца яшчэ адзін вечар фартэпіяннай кафедры кансерваторыі, на якім будуць выконвацца творы Пракоф'ева, Шастаковіча, Мяскоўскага, Глебава і іншых савецкіх кампазітараў. Падобныя вечары на шырокай канцэртнай эстрадзе бясспрэчна адыграюць вялікую музычна-выхаваўчую ролю.

Т. ШЧАРБАКОВА,
музыказнаўца.

Для воінаў-пагранічнікаў

У першамайскія дні Саюз кампазітараў Беларусі наладзіў першы выезд кампазітараў і беларускіх артыстаў да воінаў-пагранічнікаў, і з таго часу завязалася моцная творчая дружба паміж кампазітарамі і пагранічнікамі.

Днямі Саюз кампазітараў зноў накіраваў брыгаду да воінаў-пагранічнікаў. У 10 творчых сустрэчах-канцэртах прынялі ўдзел кампазітары Ул. Алоўнікаў, Р. Бутвілоўскі, музыказнаўца І. Нісневіч, спевакі Л. Ілюковіч, В. Прышчапёнак, Ю. Матраеў, цымбаліст В. Бурковіч, баяніст Р. Ган.

Канцэрты беларускіх кампазітараў і артыстаў мелі выключны поспех у пагранічнікаў.

ІХ РОДНАЯ СПРАВА

Два гады назад у вёску Цярэнічы, што на Гомельшчыне, прыехала новы дырэктар школы-сямігодкі — Іна Дзмітраўна Сахоўская. Маладую настаўніцу адразу зацікавіла: чым жывуць тут людзі, як праводзяць свой вольны час.

«Як зрабіць, каб адпачынак калгаснікаў быў культурны і цікавы? — не раз задавала сабе гэтае пытанне Іна Дзмітраўна. — А што, каб тут стварыць народны універсітэт культуры?»

Аб тым, як ствараўся гэты універсітэт на грамадскіх асновах, якія цяжкасці давялося пераадолець яго арганізатарам, як склалася яго далейшая дзейнасць, расказвае Г. Клябанаў у брашуры «Універсітэт культуры ў калгасе» (Белдзяржвыдавецтва, 1961 г.).

Аўтар расказвае, як горача падтрымалі ідэю маладога педагога камуністы і члены праўлення арцелі імя Першага мая, як пры дапамозе шэфаў калгаса, работнікаў Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў была распрацавана і зацверджана праграма заняткаў, разлічаная на два гады.

Г. Клябанаў прыводзіць поўнасцю гэтую праграму. Выказвае свае думкі аб тым, што ў ёй ёсць станоўчага, падкрэслівае недахопы. Нам думаецца, гэта правільна. Бо культасветработнікі і ўсе тыя, хто зацікаўлены ў стварэнні падобных універсітэтаў, здолеюць выкарыстаць вопыт першамайцаў. Як вядома, «штабам» універсітэта, калі можна так сказаць, з'яўляецца яго савет.

На прыкладзе першамайцаў аўтар паказвае, якім чынам будуецца навучальны працэс, а таксама гаворыць аб методыцы заняткаў (правядзенне лекцый-канцэртаў, лекцый-паказаў, тэарэтычных канферэнцый, вечароў пытанняў і адказаў і г. д.).

Зусім правільна Г. Клябанаў звяртае ўвагу не толькі на змест, але і на форму заняткаў, вылучае тыя з іх, якія праходзілі найбольш цікава, прывучалі слухачоў да самастойнага асэнсавання з'яў.

Якія б глыбокія ні былі, скажам, лекцыя або даклад, але, калі іх прачытаць па паперцы ды яшчэ напісаныя сухой, невыразнай мовай, карысці будзе мала. Калі заняткі пабудаваны цікава, ярка, слухачы не толькі запомняць іх змест, але і зацікавяцца тэмай, будуць задаваць пытанні. І гэта надзвычай добра.

У калгасным універсітэце імянна так і робяць. Яшчэ не было такога выпадку, паведамляе аўтар, каб заняткі прайшлі тут суха і сумна. Наадварот, слухачы чакаюць пачатку іх, як радаснага свята. Вельмі часта ў клубе не могуць змясціцца ўсе, хто хоча паслухаць тую ці іншую лекцыю.

Надоўга запомніліся слухачам універсітэта заняткі на тэму «Як навучыцца разумець музыку?» Спачатку была прачытана лекцыя на гэтую тэму, затым арганізавана выступленне аркестра народных інструментаў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці. А ў канцы дэманстраваліся фільмы «П. І. Чайкоўскі», «Вялікі канцэрт». Калі на занятках разглядалася сучасная беларуская песня, да слухачоў прыехаў кампазітар Ю. Семяняка. Ён расказаў, як ствараецца песня, пазнаёміў слухачоў з творчай лабараторыяй кампазітара.

У брашуры ёсць раздзелы «З дапамогаю актыву» і «Кроўная справа». Яны падрабязна расказваюць, як клуб і бібліятэка, іх актыў дапамагаюць калгаснаму універсітэту культуры.

Прыкладна ў той жа час на захадзе Беларусі, за сотні кіламетраў ад Цярэніч, у маленькім беларускім гарадку Ашмяны Арсень Якаўлевіч Фамін і Пятро Аляксеевіч Дакука стварылі Народны тэатр. У Ашмянах чіколі не было тэатра. Спачатку быў толькі драмгурток, які ставіў адналактовыя п'есы і інсцэніроўкі. А цяпер ён вырас у адзін з лепшых народных тэатраў рэспублікі. З 1948 года ашмянскі калектыў паказаў 30 адналактовых і каля 20 многаактовых п'ес. Артысты самадзейнага тэатра паставілі 430 спектакляў і абслужылі 104 тысячы гледачоў.

Пра тое, як ствараўся гэты цікавы калектыў, з якой самаддзянасцю нясуць артысты вялікую праўду мастацтва ў масы, расказваецца ў кнізе Л. Асташавай «Тэатр народных талентаў» (Белдзяржвыдавецтва, 1961 г.).

Глядач не хоча рабіць ніякіх скідак на самадзейнасць. Ён ідзе на спектакль і хоча бачыць сапраўдны кавалачак жыцця. Яго мала цікавіць, колькі даводзіцца працаваць самадзейнаму артысту, каб дамагчыся высокага майстэрства. Л. Асташава і расказвае, як самааддана працуюць самадзейныя артысты.

У артыстаў-прафесіяналаў ёсць спецыяльны час для заняткаў. Аматары ж знаходзяцца ў іншых умовах. Цэлы дзень напружана сядзіць за рулём пасажырскага аўтобуса яго вадзіцель і разам з тым вядучы акцёр Народнага тэатра тав. Лукша. Шмат энергіі адбірае ў Яўгеніі Архіпавай, любімцы публікі, яе бухгалтарская прафесія. Нялёгка адарвацца ад сваёй справы Ганне Папковай. Яна загадвае дзіцячай бібліятэкай, дзе больш за тысячу юных чытачоў, ды яшчэ ёй трэба ездзіць з кнігамі ў калгасы. Але грамадская прафесія настолькі захапіла гэтых энтузіястаў, што яны знаходзяць час для работы ў тэатры, для авалодання акцёрскім майстэрствам. І як паказвае аўтар кнігі, многа шчаслівых хвілін прыносяць яны гледачам сваёй таленавітай игрой!

Многа людзей стварае спектакль. Трэба, каб не толькі артысты, але і мастакі, грымёры, электрыкі, рабочыя сцэны з натхненнем аддавалі сваю працу. Але так у прафесіянальным тэатры. А як у народным? Там жа няма спецыяльных штатаў. Аўтар кнігі паказвае, як паспяхова спраўляюцца з гэтымі абавязкамі ашмянскія артысты.

Творчасць Народнага тэатра карыстаецца вялікай папулярнасцю ў жыхароў раёна. Часта новая песня, напісаная для тэатра самадзейным кампазітарам Дзмітрыем Дарашуком, адразу ідзе ў народ.

Дзве розныя кніжкі. Два розныя аўтары. Але іх аб'ядноўвае адно: яны гавораць пра простых савецкіх людзей, якія разумеюць і выконваюць свой грамадскі абавязак, непрыкметна робяць вялікую працу.

Цяпер, бадай, не знойдзеш такога кутка, дзе б не бурліла творчае жыццё. І гэта зразумела, людзі нашы непамерна вырасліі, узраслі іх духоўныя запатрабаванні. Яны будуюць камунізм і будуць жыць пры камунізме. Так адзначыў XXII з'езд КПСС, пра гэта гаворыць новая Праграма партыі.

У Беларусі працуе адных народных універсітэтаў больш 300. З іх — 131 універсітэт культуры. Калгаснікі, рабочыя саўгасаў, прадстаўнікі народнай інтэлігенцыі, удзельнікі руху за камуністычную працу імкнуцца авалодваць багаццем літаратуры і мастацтва.

Універсітэт культуры ў калгасе. Народны тэатр у раённым цэнтры. Гэтыя словы, што з'явіліся ў лексіконе сельскага жыхара ўсяго два-тры гады назад, трывала ўвайшлі ў жыццё. Цяпер, як падкрэсліў XXII з'езд партыі, асабліва неабходна ўсімі мерамі заахвочваць гэтыя парасткі новага, камуністычнага. Бо яны з'яўляюцца правобразам будучых культурна-асветных арганізацый, дзейнасць якіх будзе грунтавацца галоўным чынам на грамадскай аснове. Вось чаму трэба вітаць з'яўленне папулярнай літаратуры, якая расказвае пра вопыт ініцыятараў і арганізатараў універсітэтаў культуры і народных тэатраў.

Л. ГАЛІНІН.

Рэліквія працоўнай славы

Навуковыя супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея прывезлі нядаўна з чарговай экспедыцыі ў Гродзенскую вобласць цікавы экспанат — сярэбраны гадзіннік з выгравіраваным надпісам: «Герою працы Першай савецкай раённай электрычнай станцыі ў Кашыры Іоську І. А. ад УСНГ. 25.III 1919—4.VI. 1922 г.».

Гэты гадзіннік падараваны музею жонкай і дочкамі Іосіфа Аўгусцінавіча Іоські — жыхарамі вёскі Бародзічы, Зельвенскага раёна. Гісторыя працоўнага подзвігу І. Іоські пачалася ў першыя гады існавання савецкай дзяржавы.

1919 год. Полчышчы белагвардзейцаў і іншаземных інтэрвентаў насядалі на малады Савецкую краіну. У гэты цяжкі час па ініцыятыве Уладзіміра Ільіча Леніна 25 сакавіка 1919 г. каля станцыі Кашыра, у вёсцы Цернава, у 115 кіламетрах ад Масквы было пачата будаўніцтва першай у краіне электрастанцыі — Кашырскай ДРЭС.

У пачатку красавіка 1919 г. у Кашыру прыехалі першыя будаўнікі. Сярод іх быў малады рабочы, беларус, Іосіф Іоська, ураджэнец вёскі Бародзічы, Зельвенскай воласці, Ваўкавыскага павета, Гродзенскай губерні. Сын беззямельнага селяніна, ён яшчэ падлеткам пакінуў родную вёску і пайшоў на заробкі. Першыя весткі аб Кастрычніцкай рэвалюцыі засталі І. Іоську ў Чалябінску, дзе ён працаваў майстрам на ліцейным заводзе.

У гады грамадзянскай вайны І. Іоську, як актыўнага камсамольца, калчакоўцы арыштавалі і прысудзілі да расстрэлу. Ад смерці яго выратавала Чырвоная Армія.

Кваліфікаваны рабочы, ён адначасова разбураныя чыгункі на Урале і ў Паволжжы. З пад'ёмна-рамонтным поездам І. Іоська ўлетку 1919 г. прыехаў у Кашыру. На будоўлі ў 1920 г. быў толькі адзін пад'ёмны кран, усе цяжкія работы выконваліся ўручную. Часта будаўнікам прыходзілася працаваць па 18 гадзін у суткі і тут жа на будоўлі начаваць. І. Іоська выконваў найбольш складаныя работы. Быў цесляром, мулярам, слесарам, ліцейшчыкам.

Савецкі ўрад і асабіста Ул. І. Ленін клапаціліся аб будаўніках Кашырскай ДРЭС. Яны добра забяспечваліся, для іх былі пабудаваны новыя дамы. Ужо да пачатку 1921 г. будаўнічыя работы былі закончаны. І мая 1922 г. Кашырская электрастанцыя фактычна ўступіла ў строй. 4 чэрвеня 1922 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё яе. Паводле рашэння прэзідыума Усерасійскага савета народнай гаспадаркі лепшым будаўнікам было прысвоена высокае званне Героя працы. У ліку іх быў і наш зямляк І. А. Іоська. Усе Героі працы былі ўзнагароджаны сярэбранымі гадзіннікамі, а іх імёны запісаны на мармуравай дошцы, прымацаванай да франтона будынка Кашырскай электрастанцыі.

Апошнія гады жыцця І. Іоська правёў у роднай вёсцы Бародзічы, самаддана працаваў у калгасе імя Ул. І. Леніна.

Амаль сорак год прайшло з дня адкрыцця Кашырскай электрастанцыі — аднаго з першынцаў ленінскага плана ГОЭЛРО. Сярэбраны гадзіннік І. Іоські — падарунак партыі і ўрада за самаадданую працу на фронце сацыялістычнага будаўніцтва — зойме належнае месца ў экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея.

Г. САМСОНАЎ,
Л. КЛОК.

На могілках у Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка выдатнаму савецкаму артысту Аляксандру Фёдаравічу Кіставу.

Прыйшлі акцёры, рэжысёры, мастакі Рускага тэатра імя Горкага, Тэатра імя Янкі Купалы, прадстаўнікі Беларускага тэатральнага таварыства, сябры і сваякі нябожчыка.

Жалобны мітынг адкрывае дырэктар Рускага тэатра Ю. Сідараў. Ён з хваляваннем гаворыць аб заўчаснай смерці аднаго з самых любімых і папулярных артыстаў Рускага тэатра, стваральніка незабыўных шэкспіраўскіх вобразаў.

— Аляксандр Фёдаравіч Кістаў быў выдатным чалавекам і сябрам, артыстам — грамадзянінам, камуністам, які аддаў усе свае сілы і светлы талант бязмежнаму служэнню савецкаму мастацтву.

Успамінамі аб сумеснай працы з А. Ф. Кіставым падзяліліся з прысутнымі народная артыстка БССР Г. Абухавіч.

Скідаецца пакрывала і перад позіркам прысутных зроблены скульптарамі братамі Роберманамі бюст Аляксандра Фёдаравіча Кістава.

Да падножжа помніка кладуцца вянкі, жывыя кветкі.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА, (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск. вул. Захарава. 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва— 3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 00458

Друкарня выдавецтва «Звязда».